3. **Двухкомнатные** №№ 47 (3 этаж), 51 (4 этаж), 55 (5 этаж), 59 (6 этаж), 63 (7 этаж), 67 (8 этаж) – общей площадью 80,06 м², жилой площадью 41,77 м² – по цене 248 186 000 руб. за квартиру.

Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются 24 (двадцать четыре) следующие квартиры:

1. **Двухкомнатная** № 1 (1 этаж) – общей площадью 68,59 м², жилой площадью 35,63 м² – по цене 170 583 330 руб. за квартиру.

2. **Двухкомнатная** № 2 (1 этаж) – общей площадью 78,52 м², жилой площадью 36,15 м² – по цене 195 279 240 руб. за квартиру.

3. **Двухкомнатная** № 38 (10 этаж) – общей площадью 74,7 м², жилой площадью 36,09 м² – по цене 185 778 900 руб. за квартиру.

4. **Двухкомнатные** №№ 43 (2 этаж), 71 (9 этаж) – общей площадью 80,06 м², жилой площадью 41,77 м² – по цене 199 109 220 руб. за квартиру.

5. **Трехкомнатные** №№ 42 (2 этаж), 50 (4 этаж), 54 (5 этаж), 58 (6 этаж), 62 (7 этаж), 66

ЯМІНСКІЯ СПЯВАЧКІ ЗАВАЁЎВАЮЦЬ СТАЛІЧНЫЯ НАЧНЫЯ КЛУБЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У вёсцы Ямінск цяпер не да фотасесій і канцэртаў. Агароды зарастаюць зеллем. Пасля цёплых дажджоў агароды патрабуюць тэрміновай праполкі. Не зважаючы на сваю зоркавасць і бясконцыя гаспадарскія турботы, вясковыя артысткі ўсё ж вельмі паважна паставіліся да маёй просьбы і сабраліся пазіраваць. Апранулі белыя, вышытыя кветкамі кашулі і спадніцы, узялі ў рукі няскончаныя працы-вышыванкі (у Ямінску ўсе жанчыны вышываюць), селі ў цянёчку і заспявалі. Але гэта было пазней, а напачатку я завітаў у сядзібу кожнай гэтай пявунні, каб пераканацца, што не толькі ў карагодзе, але і ў агародзе ім няма роўных. Рабіў фотаздымкі за працаю, распытваў пра жыццё. Краіна павінна ведаць сваіх гераінь — простых вясковых працаўніц з залатымі рукамі і галасамі.

Надзея НОВІКАВА родам з Салігорскага раёна, скончыла Мінскае педагагічнае вучылішча па спецыяльнасці харавы дырыжор і прыехала ў Ямінск па размеркаванні. Калі аднойчы пачула спевы вясковых жанчын, стала палонніцай гэтага спеўнага жанру. Прыходзіла да іх на ферму, дапамагала даіць кароў, каб толькі спявачкі ішлі ў клуб выступаць. Выгадавала траіх дзяцей, дачакалася шасцёра ўнукаў. З'яўляецца дырэктарам Дома культуры, хоць трэці год на пенсіі. Трымаюць з мужам шмат свойскай жывёлы і птушкі. Спяваць вучылася ад сваіх артыстак. Голас у Надзеі нізкі, але зычны, сакавіты. Яна не імкнецца выдзяляцца, спявае за астатнімі, каб не парушыць гармоніі.

Ніна ВІШЧЭНЯ нарадзілася ў 1944 годзе. Працавала даяркай. Маці-гераіня, нарадзіла пяцярых дзяцей. Любіць збіраць ягады і грыбы, дапамагае лясніцтву ў нарыхтоўцы чорнай рабіны і на пасадцы лесу.

— Голас у Ніны нізкі, грудны, крыху прыглушаны, звычайна яна пачынае песні і за ёю спяваецца лёгка і звонка, — кажуць пра яе іншыя спявачкі. — Танцуе яна гэтак жа лёгка, як і спявае.

Зінаідзе РАМАНЧУК споўнілася 73 гады. Яна адорана добрым голасам і з дзяцінства марыла быць прафесійнай спявачкай. Але старэйшы брат забараніў. І наогул дарога ў спеўнае мастацтва была ў яе складанай.

— Я ў маці была адна каханачка, бацькі заўсёды бралі мяне з сабою на вяселлі і радзіны. Я схоплівала ўсе песні і запомніла іх на ўсё жыццё, — кажа пра сябе Зінаіда Іванаўна.

Шмат спяваць яна пачала толькі пасля смерці мужа, бо раней ён не пускаў яе на рэпетыцыі і канцэрты, быў дужа раўнівы. Працавала ў паляводстве, выгадавала чацвярых дзяцей. У гурце часта яна першай заводзіць песню сваім зычным нізкім голасам, басуе.

Марыя ПРУШАК нарадзілася ў 1940 годзе. Спявае па жыцці, з дзяцінства яе прыгожы голас гучаў у школе, у вясковым клубе, на вячорках. Працавала даяркай, маці трох дзяцей.

— Мы спявалі, як ехалі на дойку і як з дойкі вярталіся, — прыгадвае Марыя Яфімаўна.

Цяпер яна ўдава. Муж любіў яе за голас і за песні, якіх яна ведае безліч. На сваім падворку Марыя трымае кабылу Зорку і лёгка з ёю спраўляецца. У час спеваў у яе першая галасавая роля — весці песню. Яе голас рэдкі, звонкі, прыгожы, які ведаюць і адзначаюць нават сталічныя спецыялісты па фальклоры.

Ніна ГУК нарадзілася ў 1941 годзе. Працавала калгасным паляводам. Знаная на Любаншчыне маці-гераіня, нарадзіла 8 дзяцей, пра якіх у Ямінску ніхто не скажа дрэннага слова. Цяпер у Ніны Фёдараўны 14 унукаў і 2 праўнукі. А яшчэ яна сапраўдная майстрыха вышывання і вязання. Валодае нізкім голасам, басуе.

Тамара ПРУШАК нарадзілася ў 1952 годзе. Працавала на ферме даяркай. На пенсіі. Не можа жыць без справы, заўсёды першай спяшаецца на дапамогу суседзям.

— Агарод у яе самы дагледжаны, самы прыгожы, — кажуць пра Тамару аднавяскоўцы. У спеўным калектыве яна адносна нядаўна, але ведае шмат песень, яе нізкі грудны голас прыгожа зліваецца з іншымі галасамі.

Алена ХАДАРОЎСКАЯ нарадзілася ў 1978 годзе ў вёсцы Новая Дуброва Любанскага раёна. Скончыла Нясвіжскі педагагічны каледж, настаўнік пачатковых класаў. Цяпер — мастацкі кіраўнік Ямінскага дома культуры. У Ямінску выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей, вучыць іх спевам і музыцы. Мясцовая гаспадарка дала сям'і новы дом-катэдж, ёсць агарод. У гурце Алена спявае толькі пяць гадоў. У яе высокі, чысты, звонкі голас, яна, як і Марыя Прушак робіць падводкі ў песнях..

— От Ленка маладзец, скоранька нашы песні пераняла! — кажуць пра яе іншыя ўдзельніцы калектыву.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Любанскі раён.

Марыя ПРУШАК.

Ніна ГУК.

Алена ХАДАРОЎСКАЯ.

Ніна ВІШЧЭНЯ.

Тамара ПРУШАК.

Зінаіда РАМАНЧУК.

Надзея НОВІКАВА.

Услед за пісьмом

ПАМІНАЛЬНАЯ ЧАРКА

БАЛІЦЬ НЕ МЁРТВЫМ, А ЖЫВЫМ

У «Звязду» прыйшоў ліст ад Веры Герасімовіч з в. Крывошын Ляхавіцкага раёна. Пенсіянерка паведаміла, што на мясцовых могілках нехта выкраў з магіл вазы.
З'ява даволі банальная, бо падобнае не рэдкасць. Здараецца, што крадуць агароджы ці яшчэ горш — разбіваюць помнікі. Але выпадак у Крывошыне, на мой погляд, набыў грамадскае гучанне, бо закранае даволі сур'ёзную праблему.

Укралі вазы не толькі з магілы мужа В. Герасімовіч, але і іншых памерлых. Тры вазы зніклі і з магілы Сяргея Свянтэцкага, які загінуў у схватцы з асуджанымі. Летам 1997 года арыштанты спрабавалі вырвацца на волю з вагона, у якім іх перавозілі. Наша газета пісала пра тое супрацьстаянне, калі бандыты з нажамі і заточкамі накінуліся на салдатаў унутраных войскаў («Паядынак», «Звязда», 07. 1997 г.). Сяргея пасмяротна ўзнагародзілі ордэнам «За асабістую мужнасць» і ён быў пахаваны на могілках у Крывошыне.

Таму, хто краў вазы, было ўсё роўна, на чыёй магіле яны стаяць, ды і ноччу злодзей не будзе ўглядацца ў надпіс — украў, прадаў і зноў шукае, дзе б тысячу ўхапіць.

Але паслухаем Алу Свянтэцкую — маці загінулага салдата.

— Праз дзесяць дзён прыйшоў участковы і сказаў, што справа закрытая. Маўляў, страта невялікая, але ж нельга ўсё зводзіць да грошай. Тут, я думаю, існуе і маральны бок. Толькі як тут быць? Вось я наведала магілу сына, а там шклянка з гарэлкай стаіць, а я не магу гэтага прыняць — так не павінна быць.

— Ала Іванаўна, але людзі зрабілі гэта па-добраму. Відаць, вырашылі памянуць Сяргея.

— Якая п'янка на могілках? Гэта грэх! Паставілі гарэлку, а наўкол панакідалі паперы, шкурак... Што гэта за памінанне? Калі хочаце ўспомніць, то пакладзіце кветкі, ці што. А то пайшлі ноччу на могілкі піць. Мы супраць — у нашай сям'і так не заведзена. Чаму б не паставіць тую гарэлку на магілы сваёй радні?

— Вы, напэўна, ведаеце, хто быў на могілках?

— А яны прыходзілі да мяне і сказалі, што вазы не чапалі, а вось шклянку з гарэлкай на магілу паставілі. Ды я і сама думаю, што да тых вазаў яны справы не маюць... Адзін з іх вучыўся разам з Сяргеем.

— Вось бачыце, злога намеру не было. Хлопцы хацелі як лепш. Хоць я вас разумею.

— А колькі на свеце бяды робіцца без усякага намеру...

А вось што расказала Лідзія Бруцкая — стараста вёскі.

— У нашай вёсцы цішыня была, можа, хто чужы, хто ў бальніцы лячыўся... Я ў царкве пеўчая...

— Лідзія Сцяпанаўна, раз вы пеўчая, то скажыце, хутка будзе месяц, як гэта здарылася, можа, святар у сваім казанні нешта сказаў наконт выкрадання ваз з могілак, бо, як я ведаю, і ў суседняй вёсцы Галаўнянцы таксама нехта «папрацаваў» на могілках.

— Не, бацюшка нічога не казаў, бо да святара, напэўна, усё гэта не дайшло.

Наконт таго, піць ці не піць на могілках, паразважаем ніжэй, а пакуль што я прывяду ўрывак з ліста Веры Герасімовіч:

«Кожны год вясной — восенню можна назіраць адзін і той жа малюнак: хто-ніхто прыбярэ сваю магілу, а смецце перакіне на суседнюю, хоць ёсць спецыяльна адведзенае месца для гэтага і камунгас сістэматычна вывозіць яго».

Сітуацыя знаёмая. Радзіма для многіх заканчваецца за парогам кватэры ці за мяжой свайго ўчастка.

Часта, калі еду на дачу, бачу непадалёк ад вёскі могілкі. Плотам іх абнёс сельсавет, але з-за зелля яго не відаць. У хаты памерлых бацькоў прыязджаюць на выхадныя ці на лета дзеці ды і вёска не вымерла, але нікому і ў галаву не прыйдзе ўзяць касу і абкасіць тую крапіву з лебядою. Яшчэ на магілах радні нешта зробяць, а наўкол — ніхто пальцам не паварушыць.

«У Крывошыне ёсць царква, сярэдняя школа, сельскі Савет, шмат людзей, з якіх можна браць прыклад, але няма сумеснай работы школы, сям'і і грамадскасці па выхаванні людзей высокай маралі,» — піша наша чытачка.

Я згодзен, што неабходныя сумесныя намаганні, але каб дарасці нам да высокай маралі, патрэбна напачатку падняць бытавую культуру. Без яе ўсе нашы намаганні ў фарміраванні духоўна развітага грамадства будуць дарэмнымі.

Вось адзін прыклад. Сямігадовы хлопчык стаіць каля канапы, есць цукеркі, а паперкі кідае на падлогу.

— Ты што робіш? Бяры венік і падмятай, — кажа прыезджая жанчына.

— А хіба я баба?! — абурыўся малы.

Справа не толькі ў смецці. У малога ўжо сфарміравана абразлівае стаўленне да жанчыны.

А яшчэ людзі часта глядзяць на паводзіны свайго начальніка і перайманць яго.

Аднойчы я зайшоў у кабінет аднаго кіраўніка раёна (сёння ён сядзіць у турме, а жонка знаходзіцца ў вышуку), калі той матам крыў свайго вадзіцеля. У кабінеце знаходзіцца чужы чалавек, але гаспадара гэта не збянтэжыла, можна толькі здагадвацца, што даводзілася чуць іншым падначаленым.

Не, без побытавай культуры нам свой «камунізм» не пабудаваць.

А цяпер можна засяродзіць увагу на традыцыі, якая звязана з распіваннем гарэлкі на могілках.

Колькі разоў даводзілася бачыць, як на магіле рассцілалі абрус, ставілі бутэлькі з гарэлкай, клалі багатую закусь і пачыналі памінаць. Першую чарку падымалі «каб яму (ёй) зямля была пухам» ці «Царства яму нябеснае»; добра прыкусіўшы, выпівалі другую, і ўжо размова ішла пра зямное, а пасля трэцяй ніхто нікога не слухаў, а там браліся за чацвёртую... Падобны сцэнарый быў і на памінальнай вячэры — гарэлка весяліць, на шчоках чырвань іграе і чуецца смех...

Мёртвыя жывым не таварышы. У другіх ёсць яшчэ надзея, а ў мёртвых яе няма. І не патрэбна ім гарэлка на магіле — жывыя робяць гэта для сябе.

А калі нехта скажа, што так у нас спакон веку павялося, то я скажу, што ў нашага народа спрадвеку не было такога п'янства і брыдкаслоўя, але мы чамусьці пра гэта забываем.

Першы крок змагання з п'янствам — гэта не ператвараць памінкі ў вяселле, не распіваць гарэлку на могілках, і зрухі, упэўнены, будуць, калі і царква зробіць захады ў гэтым кірунку.

Чаму ў каталікоў на магілы ставяць свечкі, а не п'юць там гарэлку? Таму што такая ўстаноўка касцёла.

Аўтарка ліста ў «Звязду» ў мінулым выкладала ў школе рускую і беларускую мовы, і я спытаў Веру Герасімовіч: а што рабілася ў час яе маладосці? Ці быў вандалізм на могілках?

— Чутна пра такое не было. Да магіл ставіліся з павагай. І калі даводзілася там сарваць нейкую кветачку ці лісцік, то думалася: «А навошта я гэта зрабіла?» Быў нейкі страх, а каб з магілы нешта ўкрасці, то крый божа».

Сёння былога страху ўжо няма. Даводзілася бачыць, як на старых могілках збіралі грыбы... і нічога.

Вярнуць жыццё назад, у забытую каляіну, немагчыма, а ў такім разе трэба ісці наперад, шляхам, які ўжо да нас прайшлі іншыя народы Еўропы, і пераняць ад іх усё самае лепшае. А наша адметнасць няхай праяўляецца не ў чарцы на магіле, а ў нечым больш істотным.

Наш народ на многае здольны, толькі іншым разам яму трэба падказаць, накіраваць...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

ШЧЫРАСЦЬ, ЛЮДСКАСЦЬ, ЕДНАСЦЬ

У Гродне завяршыўся VIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур

Галоўныя прызы фестывалю ўжо традыцыйна вырабілі на шклозаводзе «Нёман» у Бярозаўцы. Сёлета гэта рамонак у... цыліндры з каляровага шкла. Рамонак — зразумела, гэта сімвал свята нацыянальных культур у Гродне. А вось цыліндр? Паводле задумы галоўнага мастака прадпрыемства Вольгі Падліпалінай, ягоныя грані сімвалізуюць тое, што ўсе народы і нацыі звязаныя паміж сабой, адзіныя ў сваіх імкненнях.

У падрыхтоўцы фестывалю самы непасрэдны ўдзел бяруць Міністэрства культуры, Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, Гродзенскі абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, а таксама шэраг іншых дзяржаўных і грамадскіх арганізацый краіны.

— Цудоўна, што на зямлі беларускай праходзіць такое свята — не толькі мастацтва, а яднання людзей розных нацыянальнасцяў нашай краіны, — зазначае **старшыня журы фестывалю Міхаіл ДРЫНЕЎСКІ**. — Гэта вельмі чалавечы фестываль, ён патрэбны і тым, хто на сцэне, і тым, хто іх слухае.

Памятаеце, гродзенскія старажылы і самадзейныя артысты са стажам, як усё пачыналася? Першы фестываль нацыянальных культур горад над Нёманам сустракаў 24 мая 1996 года. У ім удзельнічалі прадстаўнікі адзінацыі нацыянальных культурна-асветніцкіх аб'яднанняў, прычым не было ні журы, ні творчых адбораў, мала ў каго былі нацыянальныя строі і музычныя інструменты. А цяпер...

У адборачных турах VIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур ва ўсіх абласцях і ў сталіцы ўдзельнічалі больш за 2500 прадстаўнікоў 34 нацыянальнасцяў. Разам з беларусамі гэта азербайджанцы, армяне, афганцы, балгары, башкіры, венгры, грузіны, грэкі, дагестанцы, індыйцы, кабардзіна-балкары, казахі, карэйцы, ланкійцы (Шры-Ланка), латышы, літоўцы, малдаване, мардоўцы, марыйцы, немцы, пакістанцы, палякі, палесцінцы, рускія, татары, таджыкі, туркмены, украінцы, цыганы, чачэнцы, чувашы, эстонцы, яўрэі. Пры гэтым творчым калектывам дзяржава дапамагала і арганізацыйна, і матэрыяльна: бясплатна даваліся лепшыя канцэртныя пляцоўкі, са сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на падтрымку грамадскіх аб'яднанняў, набываліся нацыянальныя касцюмы і музычныя інструменты.

На заключны этап фестывалю ў Гродне журы адабрала каля 800 самадзейных артыстаў. А колькасць нацыянальных падворкаў з 27 сёлета павялічылася да 40! Сярод новых падворкаў — кітайскі, галандскі, афрыканскі, падворак людзей з абмежаванымі магчымасцямі розных нацыянальнасцяў. І гэта, пэўна, яшчэ не мяжа, паколькі ў Беларусі жывуць прадстаўнікі 140 нацыянальнасцяў.

— Культурная талерантнасць — магутны і дзейсны інструмент у барацьбе з прыкрымі канфліктамі і вымушаных перамяшчэнняў людзей. Фестываль нацыянальных культур садзейнічае распаўсюджванню ідэй цярпімасці, павагі і ўзаемаразумення сярод насельніцтва, умацаванню сацыяльнай гармоніі ў беларускім грамадстве, — лічыць **прадстаўнік Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь Шале САФАВІ**.

Сябры з Клецка, з якімі аўтар гэтых радкоў падарожнічаў па нацыянальных падворках, такога яшчэ ніколі не бачылі і былі проста ўражаныя. Што ні падворак — дык не толькі таленты ў танцах і спевах, але і нейкая адметнасць, сюрпрыз. Напрыклад, Гродзенскае грамадскае аб'яднанне грузінаў арганізавала сапраўднае нацыянальнае застолле — з тостамі, анекдотамі, песнямі і, безумоўна, грузінскімі стравамі — хачапуры, сулугуні, сацыві, лаваш ... На азербайджанскім падворку можна было пачуць чароўныя гукі нацыянальных інструментаў зурны і тара, убачыць «майстар-клас» выканання танца жывата і лезгінкі. На рускім, які «ахоўваўся» добрымі малайцамі ў рыцарскіх даспехах, частавалі блінамі, знаёмілі з абразамі ў стылі XII стагоддзя (працы майстра злататканага мастацтва Галіны Дзмітрыенкі), а таксама з традыцыяй надання імя дзецям. На яўрэйскім падворку апавядалі гісторыю ўдаізму мовай традыцыйных нацыянальных прадметаў і адзення, арганізавалі выставу тэкставай мазаікі. На польскім — падрыхтавалі цудоўную выставу фларыстыкі, прычым можна было атрымаць кансультацыю спецыяліста па доглядзе розных раслін. А на ўкраінскім падворку была сапраўдная печ, з якой падавалі варэнікі і пампушкі, і, акрамя таго, можна было ўбачыць старажытны абрад хрэсьбінаў і рэгістрацыі дзіцяці.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Дарэчы, і на іншых падворках па заданні журы фестывалю сёлета праклапаціліся пра тое, каб паказаць нацыянальныя асаблівасці святкавання нараджэння новага чалавека. Лагічны працяг вяселляў, якія дэманстраваліся на падворках падчас папярэдняга фестывалю два гады таму. Цікава, які абрад мы ўбачым на наступным свяце нацыянальных культур у 2012 годзе?

Увогуле на працягу трох фестывальных дзён гродзенцам і гасцям старажытнага горада арганізатары і ўдзельнікі прапанавалі 73 імпрэзы. Сярод іх і ўжо традыцыйныя — напрыклад, тэатралізаванае шэсце ўдзельнікаў, «Горад майстроў», свята нацыянальных кухняў народаў Беларусі. А дванаццаць імпрэзаў рабіліся ўпершыню. Гэта, у прыватнасці, свята дзіцячага нацыянальнага мастацтва, свята нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва, не толькі моладзевая танцавальна-забаўляльная праграма, але і «Дыскатэка 80-х»... Праванабярэжную Нёмана да сёлетняга фестывалю ўпрыгожыў «Фантан дружбы» (аўтар праекта — Аляксандр Захарчук з інстытута «Гроднаграмадзянпраект»). А ў галерэі «Крыга» адкрылася ўнікальная выстава гродзенскага мастака Уладзіміра Качана «Лікі нацыі». Гэта яго сумесны праект з тэлерадыёкампаніяй «Гродна»: партрэты маляваліся прама падчас дванаццаці тэлевізійных перадач з удзелам прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар. З гэтымі партрэтамі ў тэхніцы акрылавага жывапісу можна пазнаёміцца ў Гродне да 15 чэрвеня, а затым выстава накіруецца ў падарожжа па галерэях Польшчы, Украіны і Францыі.

...На провадах удзельнікаў свята нацыянальных культур у нядзелю, як заўсёды, прагучала: «Да пабачэння! Да новых сустрэч у Гродне!». А фестывальная палітра, дарэчы, абяцае пашырыцца. Паводле інфармацыі **Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леаніда ГУЛЯКІ**, неўзабаве разам з Міністэрствам культуры будзе абмяркоўвацца пытанне правядзення першага фестывалю культур беларусаў замежжа.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Кватэрнае пытанне

КАНДЫДАТ — НЕ ГЕРОЙ

У нашай сям'і адзін з сужэнцаў з'яўляецца кандыдатам навук. Пры будаўніцтве кватэры ў ЖБК ці будзе ён мець права на дадатковую плошчу пры вызначэнні памеру льготнага крэдыту?

В.Н., *г. Гомель.*

У адпаведнасці з падпунктам 1.6 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185 нарміруемыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання, якое ўзводзіцца, для вызначэння велічыні льготнага крэдыту вызначаюцца (з разліку на аднаго члена сям'і) для грамадзян, якія будуюць жылыя памяшканні ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, а таксама ў шматкватэрных жылых дамах у сельскіх населеных пунктах, — 20 кв. метраў (пры будаўніцтве для аднаго чалавека аднапакаёвай кватэры — 36 кв. метраў). Для грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у сельскіх населеных пунктах і будуюць у іх аднакватэрныя жылыя дамы, а таксама блакіраваныя жылыя дамы, — 30 кв. метраў (пры будаўніцтве для аднаго чалавека аднапакаёвай кватэры ў блакіраваным жылым доме — 44 кв. метры).

Героям Беларусі, Героям Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы, поўным кавалерам ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, а таксама грамадзянам, якія валодаюць у адпаведнасці з заканадаўствам правам на дадатковую плошчу жылога памяшкання на стане здароўя, названыя нарміруемыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання павялічваюцца на 15 кв. метраў на кожнага члена сям'і, які мае права на дадатковую плошчу жылога памяшкання па пералічаных падставах.

Значыць, фінансаванне будаўніцтва так званай «дадатковай» звышнарматыўнай агульнай плошчы жылога памяшкання павінна ажыццяўляцца навуковымі работнікамі (у тым ліку і кандыдатамі навук) за кошт уласных сродкаў або банкаўскага крэдыту, што выдаецца на агульных умовах.

Віктар САВІЦКІ.

Сітуацыя

ГУБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ НЕ ПІВА. А АДСУТНАСЦЬ МЕРЫ

Традыцыйна летам на вуліцах пачынаюць з'яўляцца адкрытыя кавярні, у якіх прынамсі раней апроч іншага прадаваліся і слабаалкагольныя напоі. Аднак адносна нядаўна была ўведзена адміністрацыйная адказнасць за распіццё алкагольных напояў у грамадскіх месцах. Што цяпер чакае аматараў «прапусціць» куфаль пеннага напою на свежым паветры?

Пачнём з таго, што ў вясенне-летні перыяд 2009 года продаж піва ў цэлым па краіне вялі каля 6 тысяч аб'ектаў грамадскага харчавання. Сёлета плануецца адчыніць на 30 працэнтаў больш летніх кавярняў, міні-кавярняў, арганізаваць працу пляцовак, што з'яўляюцца працягам залаў рэстаранаў, кавярняў. Адпаведнае заданне Міністэрства гандлю давяло да аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Такім чынам, плануецца, што продаж піва будуць весці больш за 7 тысяч аб'ектаў грамадскага харчавання.

Ці павялічыцца нагрузка на прадпрыемствы грамадскага харчавання ў сувязі з абмежаваннямі на спажыванне алкаголю ў грамадскіх месцах? У міністэрстве мяркуюць, што калі нагрузка і павялічыцца, дык нязначна. Нагадаем, што ўвядзенне адміністрацыйнай адказнасці за распіццё алкагольных напояў у грамадскіх месцах было скіравана на папярэджанне п'янства і алкагалізму сярод няпоўнагадовых і падлеткаў як найбольш патэнцыйных пакупнікоў слабаалкагольных напояў і піва ў аб'ектах дробнарознічнай гандлёвай сеткі. Аднак на працы аб'ектаў грамадскага харчавання новаўвядзенне ніяк не адаб'ецца: спажыванне піва і слабаалкагольных напояў у іх дазволена. Больш за тое, Міністэрства гандлю прымае меры па падаўжэнні рэжыму працы гандлёвых аб'ектаў. Толькі за мінулы год падоўжаны рэжым працы на адну-дзве гадзіны ў 6,5 тысячы крамаў, значна была павялічана колькасць крамаў, якія гандлююць півам кругласутачна (з 15 да 279).

Для максімальнага насычэння гандлёвай сеткі півам айчынных вытворцаў у арганізацыях гандлю дадаткова размяшчаюцца халадзільныя шафы і іншае гандлёвае абсталяванне (зонты, камплекты мэблі, камплекты абсталявання для разліву піва з кегаў). Напрыклад, у Мінску вытворцамі будзе пастаўлена ў гандлёвыя арганізацыі 1300 установак для продажу піва і квасу ў разліў з кегаў (летась такіх установак было пастаўлена 1000 адзінак), больш за 1700 адзінак халадзільнага абсталявання і 400 камплектаў спецыяльнага гандлёвага абсталявання (тэнты, парасоны, палаткі, вынасныя сталы і крэслы).

Згодна з папярэднімі данымі, на пачатак года ў краіне забяспечанасць месцамі ў агульнадаступнай сетцы грамадскага харчавання на 1000 чалавек склала 23,5 месца пры нарматыве 17 месцаў. Пры гэтым у сталіцы і Мінскай вобласці размешчана звыш 3,5 тысячы аб'ектаў або 30 працэнтаў ад агульнай колькасці аб'ектаў грамадскага харчавання ў краіне (усяго іх 11,7 тысячы).

Вяртаючыся да тэмы кіёскаў, ва ўпраўленні арганізацыі гандлю і паслуг міністэрства канстатуюць: менавіта з іх знікненнем найперш падлеткі пазбавіліся магчымасці без асаблівых праблем набываць піва. Спецыялісты дадаюць, што ў 2009 годзе ў краіне на душу насельніцтва было спажыта на 0,42 літра алкагольных напояў менш, чым у 2008 годзе. Разам з тым гэты паказчык застаецца яшчэ даволі высокім (11,97 літра на чалавека). Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, гранічны ўзровень спажывання алкагольных напояў не павінен перавышаць 8 літраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПІВА ВЯРТАЕЦЦА НА ПРЫПЫНКІ, АЛЕ ТОЛЬКІ Ў ПАВІЛЬЁНЫ

У хуткім часе ў сталічнай вобласці будзе адменена забарона на гандаль півам і іншымі слабаалкагольнымі напоямі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не болей за 7 працэнтаў у павільёнах з гандлёвай залай, што месціцца на прыпынках грамадскага транспарту. Гаворка ідзе менавіта пра такія павільёны, а не пра звычайныя кіёскі, асабліва падкрэслілі журналісту «Звязды» ва ўпраўленні гандлю і паслуг Мінаблвыканкама.

Нагадаем, забарона на продаж піва і слабаалкагольных напояў у кіёсках на прыпынках грамадскага транспарту была ўведзена ў Мінскай вобласці ў канцы лета мінулага года. Цяпер пенны напой зможа вярнуцца ў павільёны, што маюць гандлёвую залу. Рашэнне ўжо прайшло экспертызу і ўвойдзе ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання ў абласной газеце. На думку намесніка начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Анатоля ЮРАСТАВА, адбудзецца гэта на працягу тыдня. Мы пацікавіліся ў суразмоўцы як мэтай новаўвядзення, так і магчымым асартыментам піва, які павінен будзе з'явіцца ў вышэйназваных аб'ектах дробнарознічнай гандлёвай сеткі.

Анатоль Віктаравіч пацвердзіў, што, бясспрэчна, мэтай адмены забароны на гандаль півам з'яўляецца павелічэнне аб'ёмаў продажу пеннага напою.

— Наша рэкамендацыя: каб у продажы было да 95 працэнтаў піва найперш айчыннай вытворчасці. Аднак прымушаць выконваць гэты паказчык ніхто нікога не будзе. Так што ў павільёнах з гандлёвай залай, якія размешчаны на прыпынках грамадскага транспарту, натуральна будзе прадавацца і імпартнае піва.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Другі па ліку шлюб мужа — не перашкода для атрымання льготнага крэдыту

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Жыхарка вёскі Арэхаўка Клічаўскага раёна хвалюецца за сваю дачку Алену, якая жыве ў Магілёве, вось з якой нагоды. Паводле слоў заяўніцы, дачка летась стала ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Ёй яшчэ няма 30 гадоў, а вось мужу ўжо 40. І ў выбранніка дачкі гэта ўжо другі па ліку шлюб (у Алены першы). Вось маці і пытаецца: ці будзе мець права гэтая сям'я, калі падыдзе чарга, атрымаць ільготны крэдыт? Ці не перашкодзяць вышэйназваныя акалічнасці, у прыватнасці, другі па ліку шлюб мужа, атрымаць той крэдыт?

Каб заспакоіць маці і дапамагчы атрымаць ёй кампетэнтны адказ, рэдакцыя мусіла зрабіць афіцыйны запыт у адміністрацыю Ленінскага раёна Магілёва. Вось які адказ мы атрымалі адтуль.

«Дачка заяўніцы са складам сям'і 2 чалавекі (сама, муж) стаіць на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў у адміністрацыі Ленінскага раёна г. Магілёва з 24.11.2008 г. за №14251.

Цяпер льготныя крэдыты на будаўніцтва жылой плошчы выдаюцца грамадзянам, што стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.04.2000 г. №185.

Сям'я дачкі заяўніцы прызнаная як маючая патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і ёй будзе прапанавана, у парадку чарговасці, будаўніцтва жылой плошчы ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам. Другі па ліку шлюб мужа дачкі заяўніцы не перашкодзіць гэтай сям'і атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылой плошчы».

Сяргей РАСОЛЬКА.

АХВЯРА МАХЛЯРАК — 87-ГАДОВАЯ БАБУЛЯ

Пенсіянерка паверыла, што да яе прыйшлі з ЖЭСа, і ўпусціла ў кватэру дзвюх незнаёмых жанчын.

Нахабніцы былі вельмі настойлівыя: каб трапіць у кватэру на вуліцы Мележа, паведаміла прэс-афіцэр Савецкага РУУС Вольга Яскевіч, яны доўга званілі ў жыллё, пакуль старая жанчына, якая ў гэтую раніцу нікога не чакала, дайшла і адчыніла ім дзверы. Нахабніцы назваліся пацярпелай работніцамі ЖЭСа і дадалі, што завіталі да яе з добрай навіной: маўляў, у кватэры пенсіянеркі старая газавая пліта будзе мяняцца на новую. І прапанавалі на выбар некалькі мадэляў пліт. На абмеркаванне ўсіх дэталяў спатрэбілася 15 хвілін, за якія, як высветлілася пазней, махляркі паспелі знайсці і ўкрасці збержэнні сваёй ахвяры. Толькі бліжэй да вечара бабулька выявіла, што ў яе знікла паўтара мільёна рублёў. Зараз праваахоўнікі расшукваюць «ліпавых» работніц ЖЭСа.

Ігар ГРЫШЫН.

ЦЯГНУЎ, КОЛЬКІ МОГ

З будоўлі кавярні-бара ў Бярозе скралі керамічную плітку, батарэі ацяплення, кацёл — усяго на суму 8 653 000 рублёў. Устаноўлена, што крадзеж учыніў раней судзімы 30-гадовы жыхар Бярозы. Яго шукаюць.

З КІМ ЗБІРАЎСЯ ВАЯВАЦЬ?

У 49-гадовага жыхара Кобрына супрацоўнікі праваахоўных органаў знайшлі цэлы арсенал зброі. У доме ён трымаў тры дробнакаліберныя вінтоўкі, карабін паляўнічы, тры паляўнічыя стрэльбы, самаробны дробнакаліберны пісталет, а таксама патроны і боепрыпасы да названай зброі. Зброя канфіскаваная, заведзена крымінальная справа, а гаспадар арсенала ўзяты пад варту.

Яна СВЕТАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Любанскі раён.

Ланцугі яго цяжкія...

Ланцугі агульнай вагой 2280 кг зняў з транспарцёра ў канцы працоўнага дня непрацуючы, раней судзімы мясцовы грамадзянін. Разукамплектаваны злодзеем агрэгат знаходзіўся на тэрыторыі фермы ў вёсцы Страковічы (СВК «Прагрэс») Светлагорскага раёна. Але ж не паспеў грамадзянін іх рэалізаваць — міліцыя вярнула выкрадзенае ў гаспадарку. А вось злодзея, які вывез 17 чыгунных пліт з двара дачнага дома ў вёсцы Гусевіца Буда-Кашалёўскага раёна, пакуль шукаюць праваахоўнікі. Як і таго, хто ў вёсцы Крупейкі Лоеўскага раёна з зачыненага хлява побач з прыватнай будоўляй «спёр» 10 металічных труб.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КАРАЛЕВА-ПРЫГАЖУНЯ — БУДУЧЫ АГРАРЫЙ

Тытулу прыгажосці «Міс Саюза незалежных дзяржаў-2010» была ўдастоена ў расійскім горадзе Арэнбург студэнтка Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» Дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Марыя Вялічка. Дарэчы, Беларусь упершыню брала ўдзел у конкурсе. І яе адзіная прадстаўніца, наша Маша, і перамагла.

Прыгажуня ўдзельнічала ў конкурсе прыгажосці сярод студэнтак ВНУ садружнасці аграрнага профілю. На сцэне канцэртнай залы Арэнбургскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта за перамогу змагаліся дзесяць прадстаўніц розных ВНУ.

Канкурсантка з Беларусі, студэнтка другога курса, зачаравала членаў журы падчас дэфіле ў традыцыйных народных строях, была на вышыні падчас творчага конкурсу, «візітак» (пра сябе і ВНУ).

Віцебскай студэнтцы ўручылі карону, залатое кальe, знакаміты арэнбургскі «брэнд» — пуховыя хусткі. А яе родная ВНУ атрымала права правесці чарговы конкурс прыгажунь — будучых аграрыяў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 4 (четырёх) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

лот 1 — земельный участок в деревне Кучкуны, участок № 1, площадь участка 0,1537 га, кадастровый номер участка 622085708601000145, начальная цена 7 685 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 4 километра, район индивидуальной застройки, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод);

лот 2 — земельный участок в деревне Кучкуны, участок № 2 площадью 0,1537 гектара, кадастровый номер участка 622085708601000146, начальная цена 7 685 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 4 километра, район индивидуальной застройки, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод);

лот 3 — земельный участок в агрогородке Раков, участок № 92 площадью 0,2372 гектара, кадастровый номер участка 622085715632000139, начальная цена 23 720 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод), в населенном пункте имеется газ;

лот 4 — земельный участок в деревне Душково площадью 0,25 гектара, кадастровый номер участка 622085706101000172, начальная цена 12 500 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 8 километров.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **09 июля 2010 года** в 10.00 по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 05 июля 2010 года** (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8 029 1405437

ОАО «МИНСКИЙ ПРИБОРОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объекта недвижимости в долях, расположенного в г. Минске по ул. Академика А.К. Красина, 201. Продавец — Производственное унитарное предприятие «Завод Радиан» Открытого акционерного общества «Минский приборостроительный завод»

Лот 1 — доля площадью **4 348,4 кв. м,** в размере **21742/44301** в праве общей собственности на незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-33429, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Академика А.К. Красина, 201.

Лот 2 — доля площадью **3 365,8 кв. м,** в размере **16829/44301** в праве общей собственности на незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-33429, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Академика А.К. Красина, 201.

Лот 3 — доля площадью **1 146,0 кв. м,** в размере **5730/44301** в праве общей собственности на незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-33429, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Академика А.К. Красина, 201.

Начальная цена продажи составляет:

Лот 1 — 1 199 016 000 рублей Республики Беларусь с учетом НДС (20 %)

Лот 2 — 874 692 000 рублей Республики Беларусь с учетом НДС (20 %)

Лот 3 — 253 890 000 рублей Республики Беларусь с учетом НДС (20 %)

Задаток в размере 5 % от начальной цены объекта перечисляется в срок до проведения торгов на расчетный счет УП «Завод Радиан» ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012013610018 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 334, УНН 808000209.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Условия оплаты: возможна оплата в рассрочку.

Срок заключения договора: 10 (десять) рабочих дней с момента проведения аукциона.

Аукцион состоится **8 июля 2010 года** в 13.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58. Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 7 июля 2010 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58.

Справки по телефонам: (017) 293 94 40 ОАО «Минский приборостроительный завод», (017) 299 44 10 ПУП «Завод Радиан».

УНП 100363840.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

Лот № 1. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальные строения инв. № 420/С-28418, инв. № 420/С-28419, инв. № 420/С-28420, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000007 площадью 1,3270 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 249 827 438 руб., сумма задатка – 24 982 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: Инв. № 420/С-28418 – одноэтажное кирпичное здание хранилища техники 1976 г. п., общ. пл. 1606,1 кв. м; кабельная линия электропередачи подземная 0,4 кВ 1976 г. п., 147,7 п. м. **Инв. № 420/С-28419** – одноэтажное кирпичное здание радиомастерской 1955 г. п., общ. пл. 189,6 кв. м; водопроводная сеть стальная 1976 г. п., 234,5 п. м; кабельная линия электропередачи подземная 0,4 кВ 1976 г. п., 23,7 п. м; асфальтобетонное покрытие 1975 г.п. пл. 721,6 кв. м. **Инв. № 420/С-28420** – одноэтажное кирпичное здание хранилища техники 1976 г. п., общ. пл. 1595,5 кв. м; кабельные линии электропередачи подземные 0,4 кВ 1976 г. п., 132,9 п. м, 33,1 п. м	
Лот № 2. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальные строения инв. № 420/С-30936, инв. № 420/С-30937, инв. № 420/С-30938, инв. № 420/С-30939, инв. № 420/С-30337, инв. № 420/С-30338, инв. № 420/С-30340, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, 51, здание хранилища техники южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000023 площадью 1,4618 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 272 729 156 руб., сумма задатка – 27 272 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: Инв. № 420/С-30936 – одноэтажное кирпичное здание хранилища техники 1976 г. п., общ. пл. 1593,5 кв. м; две кабельные линии электропередачи 1976 г.п., 52,8 п. м и 102,5 п. м. **Инв. № 420/С-30937** – одноэтажное кирпичное здание КТП 1970 г. п. с двумя холодными пристройками и террасой, общ. пл. 162,3 кв. м; кабельная линия электропередачи 1976 г. п., 62,3 п. м. **Инв. № 420/С-30938** – одноэтажное кирпичное здание хранилища техники 1975 г. п., общ. пл. 1596,2 кв. м; кабельная линия электропередачи 1975 г. п., 27,6 п. м. **Инв. № 420/С-30939** – одноэтажное кирпичное здание склада 1985 г. п., общ. пл. 23,4 кв. м. **Инв. № 420/С-30337** – одноэтажное кирпичное здание автозаправочной 1974 г. п., кирпичная, общ. пл. 23,1 кв. м; кабельная линия электропередачи 1976 г. п., 10,7 п. м; асфальтобетонное покрытие 1975 г. п., 2478,9 кв. м с бордюром дорожным 64,1 п. м. **Инв. № 420/С-30338** – одноэтажное кирпичное здание автозаправочной 1974 г. п., общ. пл. 18,7 кв. м, кабельная линия электропередачи 1976 г. п., 26,9 п. м. **Инв. № 420/С-30340** – одноэтажное кирпичное здание склада 1958 г. п., общ. пл. 124,5 кв. м; кабельная линия электропередачи 1975 г. п., 32,6 п. м	
Продавец недвижимого имущества по лотам 1, 2: Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», контактный телефон (8 0163) 41 25 92	
Условия использования недвижимого имущества по лотам 1, 2: вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи	
Условия использования земельных участков, ограничения по использованию по лотам 1, 2: получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта, осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок	
Лот № 3. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га сроком на 10 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 208 335 080 руб., сумма задатка – 20 833 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон: (8 0152) 41 78 96	
Сведения об объектах недвижимости: двухэтажное кирпичное здание производственного корпуса с двумя пристройками, 1949 г. п., пл. 684,1 кв. м; асфальтовое покрытие 2000 г. п., пл. 253 кв. м; водопроводная сеть стальная 1949 г. п., протяженностью 42,5 п. м	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок	
Лот № 4. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальные строения инв. № 450/С-903, инв. № 450/С-900, инв. № 450/С-901, инв. № 450/С-902, инв. № 450/С-904, инв. № 450/С-10430, инв. № 450/С-10431, инв. № 450/С-10547, инв. № 450/С-10553; многолетние насаждения, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Советская, 60, военный городок № 4 и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100000002288 площадью 0,7102 га сроком на 10 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 197 110 161 руб., сумма задатка – 19 711 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Государственное лесохозяйственное учреждение «Ивацевичский военный лесхоз», контактный телефон: (8 01645) 2 35 45, 2 24 54	
Сведения об объектах недвижимости: Инв. № 450/С-903 – одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающего цеха 1953 г. п. с пристройкой 1990 г. п., пл. 798,6 кв. м, имеется электроосвещение; бетонное покрытие 1990 г. п., пл. 133 кв. м; асфальтобетонное покрытие 1990 г. п., пл. 395 кв. м; забор железобетонный 1988 г. п., протяженностью 307 п. м; ворота металлические механизированные с металлической калиткой 1988 г., пл. 11,05 кв. м. **Инв. № 450/С-900** – одноэтажное кирпичное здание гаража 1988 г. п., пл. 178,8 кв. м, имеются две смотровые ямы, электроосвещение. **Инв. № 450/С-901** – одноэтажное кирпичное здание склада 1988 г. п., пл. 88,7 кв. м. **Инв. № 450/С-902** – одноэтажное кирпичное здание склада ГСМ 1988 г. п., пл. 43,9 кв. м, имеется электроосвещение. **Инв. № 450/С-904** – одноэтажное деревянное здание сторожки с пристройкой 1999 г.п., пл. 9,6 кв. м, имеется печное отопление, электроосвещение. **Инв. № 450/С-10430** – эстакада железобетонная 1988 г. п., пл. застройки 26 кв. м; забор железобетонный 2005 г. п., протяженностью 42,2 п.м. **Инв. № 450/С-10431** – кабельная линия электропередач 1980 г. п., протяженностью 229 п.м. **Инв. № 450/С-10547** – водопроводная сеть внутридворовая 1980 г. п., протяженностью 35 п. м. **Инв. № 450/С-10553** – канализационная сеть внутридворовая 1980 г. п., протяженностью 31 п. м. Многолетние зеленые насаждения 1988 г. п.: клен (1 ед.), березы (9 ед.)	
Условия использования недвижимого имущества: благоустройство территории и вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи	
Условия использования земельного участка: получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года; осуществление строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; ограничения по использованию: охранная зона магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, площадь 0,0097 га	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **12 июля 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по 8 июля 2010 года до 16.00, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

7. Аукцион по конкретному предмету торгов признается нерезультативным, если в результате торгов данный объект не был продан в порядке, установленном законодательством, кому-либо из участников торгов. Аукцион по конкретному предмету торгов признается несостоявшимся, если торги не состоялись в связи с отсутствием участников торгов либо наличием только одного участника.

8. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

12. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества продавец вправе расторгнуть договор купли-продажи в одностороннем порядке в соответствии с действующим законодательством без компенсации расходов.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

№ лота	Наименование объекта аренды, его характеристика (год постройки, общая площадь, коммунальные услуги при наличии)	Адрес объекта аренды, контактный телефон для осмотра объекта	Арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена права заключения договора аренды с НДС (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
1	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 1 эт., комн. 117	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-62	64,2 кв.м	674100	30000
2	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 2 эт., комн. 211	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-62	16,8 кв.м	176400	10000
3	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 401	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-63	91,3 кв.м	958650	50000
4	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 403	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-64	398,0 кв.м	4179000	200000
5	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 405	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-65	19,1 кв.м	200550	10000
6	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 404	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-66	18,6 кв.м	195300	10000
7	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 407	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-67	78,1 кв.м	820050	40000
8	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 410	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-68	47,9 кв.м	502950	25000
9	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 416	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-69	22,28 кв.м	233940	10000
10	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 5 эт., комн. 515	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-70	12,7 кв.м	133350	5000
11	390 - «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 5 эт., комн. 518	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280-25-28, 287-37-71	12,7 кв.м	133350	5000
12	6 - административное здание, 1969 г., 445 кв.м, э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 1 эт.	г. Минск, ул. Уручская, 27, тел. 280-25-28, 266-59-51	16,8 кв.м	176400	8000
13	6 - административное здание, 1969 г., 445 кв.м, э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 1 эт.	г. Минск, ул. Уручская, 27, тел. 280-25-28, 266-59-52	12,1 кв.м	127050	5000
14	6 - административное здание, 1969 г., 445

Струмені прахалоды

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сам сабе псіхолаг

Сіндром эмацыйнага выгарання:

ЯК НЕ ЗГАРЭЦЬ ДАТЛА

Выраз «згарэць на працы» вядомы ўсім. Часцей за ўсё так кажуць пра працаголікаў, якія не ведаюць упыну ў сваім запале вызначыцца на ніве працоўных здзяйсненняў. Але, аказваецца, на працы можна яшчэ і выгараць. Так, менавіта так — выгараць эмацыйна.

Сіндром эмацыйнага выгарання (СЭВ) — гэта стойкі і цяжкі стан псіхалагічнага ператамлення, выкліканы частымі і працяглымі перагрузкамі і стрэсамі на працы. Чалавек перастае адчуваць хоць якую-небудзь матывацыю, у яго зніжаецца самаацэнка, падае працаздольнасць і ўзрастае напружанасць у стасунках з калегамі.

Калі стрэс становіцца хранічным, эмоцыі «выключаюцца» і наступае поўная абыякавасць да таго, што адбываецца. Чалавек «выгараў». Думкі пра працу выклікаюць агіду, і ўсё, што робіцца, — робіцца механічна, без зацікаўленасці ў выніку.

Часцей за ўсё да сіндрому эмацыйнага выгарання схільныя тыя, чыя дзейнасць так ці інакш звязана з дапамогай людзям. Урачы і медсёстры, педагогі, сацыяльныя работнікі — усе яны трапляюць у групу павышанай рызыкі. Аднак у наш век вострай канкурэнцыі, падагрэтай крызісам, любы чалавек можа лёгка там апынуцца.

Крызіс развязаў працадаўцам рукі, зазначаюць псіхатэрапеўты. Цяпер яны выкарыстоўваюць людзей, што называецца, на знос, а незадаволеных просяць неадкладна звальняцца. Тыя, хто хоча нават не пабудаваць кар'еру, а проста ўтрымацца на сваім месцы, вымушаныя, сціснуўшы зубы, цярпець і цягнуць воз абавязкаў, які пастаянна папаўняецца. Людзі не чуюць за гэта звычайных слоў падзякі, не кажучы ўжо пра матэрыяльныя заахвочванні. Дарэчы, эмацыйны голад нікольк не меншая прычына спустошанасці і абыякавасці.

На гэтым фоне ўсе іншыя бакі жыцця — сям'я, стасункі з сябрамі, асобаснае развіццё — адыходзяць нават не на другі, а на трэці-чацвёрты план, таму што пасля працы сілаў ні на што, акрамя піва і тэлевізара, ужо не застаецца. Людзі ператвараюцца ў зомбі, якія на аўтамаце маршыруюць на службу і назад. У сітуацыі, калі ў якасці матывацыі працадаўцам выкарыстоўваецца выключна бізун, ад людзей не варта чакаць нічога, акрамя поўнай абыякавасці і механічна выкананых абавязкаў, сцвярджаюць спецыялісты.

Хранічная стомленасць — першая прыкмета таго, што вы вось-вось «выгарыце». Другая — глыбокая асобасная адасобленасць, негатыўнае або нават цынічнае стаўленне да працы. І трэцяя прыкмета — зніжэнне самаацэнкі і прафесійнай матывацыі, адсутнасць перспектыў для далейшага прафесійнага росту.

Што рабіць, калі становіцца зразумелым, што вось-вось настане ваш персанальны канец свету? Выйсцяў тры:

1. Утапічнае. Патлумачыць працадаўцу сваю пазіцыю і паспрабаваць данесці да яго меркаванне аб тым, што матэрыяльная ўзнагарода павінна павялічвацца прама прапарцыянальна службовым абавязкам супрацоўніка.

2. Лагічнае. Напісаць заяву аб звальненні. Ці выйсце гэта? Часам так.

3. Практычнае. Паспрабаваць справіцца з сітуацыяй самастойна. Гэты шлях самы цяжкі, але затое і самы правільны.

Што можа зрабіць чалавек, які хоча ўзяць сітуацыю пад свой кантроль? Самае простае, як раяць псіхатэрапеўты, — дакладна вызначыць для сябе, якія мэты для яго першарадныя.

Каб не зведаць татальнага спусташэння, ва ўсім трэба захоўваць разумную дастатковасць і не дапускаць перакосу. Як толькі вы адчуеце, што праца пачынае празмерна захопліваць, а сілаў у вас застаецца ўсё менш, спыніцеся. Падумайце пра тое, што ў сутках усяго 24 гадзіны. З іх 8 гадзін ідзе на сон, яшчэ 8 — на працу. На родных і сяброў, на хобі, заняткі спортам або простую прагулку застаецца ўсяго нічога — асабліва з улікам таго, колькі часу кожнаму з нас даводзіцца траціць на дарогу.

Суадносіце тое, што вы аддаяце, з тым, што атрымліваеце. Сэнс жыцця любога чалавека — у няспынным росце і развіцці, у тым, каб нават у глыбокай старасці захаваць смак да жыцця. Калі праца дапамагае вам у гэтым — добра. Калі не, то трэба правесці невялікую інвентарызацыю ўласных мэтаў. Зразумейце, што вашы мэты і мэты працадаўцы — далёка не заўсёды адно і тое ж.

Акрамя таго, неабходна навучыцца кантраляваць свае эмоцыі. Бо ніхто не можа гарантаваць вам таго, што на новым месцы ўсё не будзе развівацца па тым жа сцэнарыі: растучыя нагрузкі — стомленасць — стрэс — спустошанасць. Вы цалкам здольныя кіраваць сітуацыяй і несці адказнасць за тое, што нешта складваецца так, а не інакш. Таму навучыцеся захоўваць баланс — як часавы, так і энергетычны.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

На скрыжаванні думак

АГУЛЬНАЯ КУЛЬТУРА НАСЕЛЬНІЦТВА ЗНАХОДЗІЦЦА... У БАКУ АД ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ?

Патрэбен элементарны «лікбез»: як правільна займацца фізічнымі практыкаваннямі, хадзіць, бегаць...

Паводле інфармацыі начальніка аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама Уладзіміра Чыгірынава, пры наборы ў ДЮСШ выяўляецца, што каля дваццаці працэнтаў дзяцей маюць адхіленні ў стане здароўя. Зразумела, што ўсе яны прыходзяць з агульнаадукацыйнай школы. І таму варта задумацца: у чым жа прычына такога фізічнага стану нашых дзяцей? Як гэтую сітуацыю палепшыць?

Вось якія меркаванні былі выказаныя па прапанове карэспандэнта «Звязды» за «круглым сталом» у аддзеле фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама.

Сяргей САВІЦКІ, загадчык аддзела Гродзенскага дзяржаўнага абласнога цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў:

— Паводле звестак, што далі нам аддзелы адукацыі райвыканкамаў, да асноўнай медыцынскай групы па стане здароўя адносяцца 84,4 працэнта навучэнцаў. Не скажу, што сітуацыя спрыяльная, але адмоўнай дынамікі ў параўнанні з мінулым годам няма, пагаршэння па асноўнай медыцынскай групе мы не назіраем. Праўда, крытэрыі ацэнкі стану здароўя могуць быць розныя. Ва ўрачоў спартыўнай медыцыны — больш паглыблены медыцынскі агляд, адпаведна, і больш выяўляецца паталогіі.

Трэці ўрок фізкультуры, які ў нас забралі, спрабуем кампенсаваць, выкарыстоўваючы ўнутраныя рэзервы. У гуртках і секцыях спартыўнай накіраванасці ў вобласці займаецца 71 працэнт навучэнцаў, у факультатывах па фізічнай культуры — 14 працэнтаў.

Добрыя прыклады ёсць. Скажам, Гродзенскі райвыканкам прыняў рашэнне закупіць трэнажорныя комплексы, і сёння іх маюць усе агульнаадукацыйныя ўстановы. Прычым не толькі дзеці займаюцца, а аказваюцца платныя паслугі для ўсіх, хто хоча.

Надзённая задача ў тым, каб наблізіць не толькі да дзяцей, але і да іх бацькоў, усяго насельніцтва добрую спартыўную базу. І ў першую чаргу — рэканструяваць спартыўныя пляцоўкі агульнаадукацыйных устаноў, якія знаходзяцца непасрэдна ў мікрараёнах.

Святлана ГЕРЦАВА, метадыст аддзела адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна:

— Па выніках медыцынскага агляду, які праходзіў у гэтым годзе, у першыя класы прыходзіць 33,6 працэнта дзяцей з першай групай здароўя. Аднак да выпускнога класа, гэта ўжо гадамі праверана, цалкам здаровых становіцца амаль удвая менш. Па структуры захворванняў на першым месцы — паталогія зроку, затым — парушэнні паставы, скаліёз. І не толькі настаўнік фізкультуры на сваіх уроках павінен займацца прафілактыкай захворванняў. Тут вялікі пласт працы для ўсіх педагогаў-прадметнікаў. На кожным уроку — тыя ж фізкультхвілінкі і г.д.

Што датычыцца спартыўных секцый, ДЮСШ, то многае залежыць ад зацікаўленасці бацькоў. Раблю такую выснову з уласнага вопыту, калі мне тэлефануюць бацькі з просьбай падказаць, дзе можна запісацца ў тую ці іншую секцыю. Ёсць такі інтарэс — дзеці будуць займацца.

Эдуард КРАЎЧАНКА, начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна:

— Відавочна, што стан здароўя дзяцей у нас, так бы мовіць, стабільна не бліскучы. 25—30 працэнтаў аднесеных да групы абсалютна здаровых — вельмі нізкі паказчык. І можна спрагназаваць, што скарачэнне колькасці ўрокаў фізкультуры адмоўна адаб'ецца перш за ўсё на дзецях з паслабленым здароўем, якія не наведваюць спартыўныя секцыі.

Зразумела, для спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў у школах трэба актыўна задзейнічаць шосты дзень. І гэта робіцца. Аднак там, дзе тысяча і больш навучэнцаў, проста немагчыма гэта арганізаваць на якасным узроўні. Ды і сілком не прывядзеш на гэты шосты дзень.

Лічу, што вялікую ролю ў аздараўленні і дзяцей, і дарослых магла б адыграць спартыўная база па месцы жыхарства, як гэта робіцца, напрыклад, у суседнім Беластоку.

Юрый ГОРБАЧ, настаўнік фізкультуры гімназіі № 6:

— У грамадстве памяняліся інтарэсы, прыярытэты. Бацькі націскаюць на дзяцей, каб яны лепш вучыліся і пры гэтым не задумваюцца пра фізічнае выхаванне. Нават таленавітых дзяцей пры такой пазіцыі бацькоў становіцца цяжка «выцягнуць» у спартыўную секцыю. Дзеці вырастаюць без разумення, што трэба займацца фізічнымі практыкаваннямі, сваім здароўем.

Вось карцінка, неяк ўбачаная мной у адной з замежных краін. Спартыўны палац, прыязджаюць тата з мамай ці дзядуля з бабуляй, прывозяць сына альбо ўнука. Дарослыя п'юць сок, а дзіця ў гэты час займаецца. А паколькі бачыць, што бацькі гэтаму радуюцца, то ў яго дадатковы стымул. У нас такой культуры няма.

Альбо сустракаю сваю былую вучаніцу, якая ніколі не хацела бегаць. А тут — бяжыць. Спыняю яе: «Вера, што здарылася?» Аказваецца, падчас вучобы ў Гродзенскім дзяржуніверсітэце імя Янкі Купалы яна праходзіла практыку ў Франкфурце-на-Майне. «Ведаеце, там усе бегаюць» — кажа дзяўчына.

А мы людзей не пераконваем і яны не разумеюць, што фізічныя практыкаванні — для іх жа карысці.

Аляксандр КІСЕЛЬ, настаўнік фізкультуры Гродзенскай гарадской гімназіі:

— Мы сталі больш праводзіць пазакласных спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў. У тым ліку, дарэчы, і сямейных, калі ў суботу бацькі прыходзяць разам з дзецьмі і ўдзельнічаюць у розных спаборніцтвах — у плавальным басейне, спартыўнай зале. Ёсць у нас і трэнажорная зала, адзін з пяці выкладчыкаў фізкультуры працуе непасрэдна з навучэнцамі спецыяльных медыцынскіх групаў.

І ўсё ж, на маю думку, ад трэцяга ўрока фізкультуры адмовіліся дарэмна. Бо, як правіла, у пазакласных мерапрыемствах, слабаборніцтвах удзельнічаюць мацнейшыя дзеці. А вось слабейшыя, якія адстаюць у фізічным развіцці, з іх выпадаюць.

Наталля КАЛЕНЧЫЦ, настаўнік фізкультуры гімназіі № 3:

— У нас таксама някепская спартыўная база, у прыватнасці, трэнажорная зала, куды з задавальненнем прыходзяць і дзеці, і бацькі. І секцыі цалкам запоўненыя. Але, на жаль, там мала старшакласнікаў, бо яны паглыблена займаюцца фізікай, матэматыкай, біялогіяй і менш наведваюць спартыўныя секцыі.

Святлана МІНЬКО, настаўнік фізкультуры СШ № 26:

— Урок дае нашмат больш, чым факультатывы і секцыйныя заняткі. Хаця б па той прычыне, што ўрок — гэта абавязалаўка. Непрыгожае, канешне, слова, але тым не менш... А на секцыйныя заняткі сёння можна пайсці, а заўтра сказаць, што не хочацца.

Андрэй МАНЧЫК, метадыст аддзела адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна:

— Сапраўды, калі гэта ўрок фізічнай культуры, то ў любым выпадку прыходзяць і займаюцца. Таму скарачэнне колькасці ўрокаў фізкультуры, натуральна, скарачае і рухальную актыўнасць навучэнцаў.

Сяргей ЧАРНЯЎСКІ, настаўнік фізкультуры гімназіі № 10:

— На мой погляд, агульная культура насельніцтва застаецца, скажам так, у баку ад фізічнай культуры. І тут нам трэба разам нешта рабіць, каб не толькі школьнікаў прыцягваць да заняткаў фізкультурай, але і выхаванцаў дзіцячых садкоў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, ВНУ, іх бацькоў.

Як можа паўплываць трэці ўрок фізкультуры? Толькі станоўча. Але пад гэта павінна быць закладзена матэрыяльная база. Так, некаторыя навучальныя ўстановы маюць і басейны, і некалькі спартыўных залаў, пляцовак. А ў іншых школах, дзе 2 тысячы, а то і больш навучэнцаў, ёсць толькі адна спартзала. І так цесна, а пры трох уроках фізкультуры яны будуць проста «душыцца».

Уладзімір ЧЫГІРЫНАЎ, начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама:

— Каб павысіць узровень фізічнага развіцця дзяцей і ўвогуле насельніцтва краіны, павінен быць комплексны падыход па ўсіх кірунках. І пачынаць трэба перш за ўсё з развіцця матэрыяльнай базы. А можа, не столькі з базы, колькі з узбраення насельніцтва ведамі, як правільна займацца фізічнымі практыкаваннямі. Як правільна хадзіць, бегаць, дыхаць, апранацца адпаведна надвор'ю, харчавацца... Патрэбны элементарны «лікбез».

Слаба працуюць у гэтым кірунку фізкультурныя работнікі, СМІ. Мы павінны пастаянна «капаць» на псіхіку людзей, што трэба займацца фізічнай культурай. І абгрунтоўваць — чаму. Якую карысць, выгаду, у тым ліку і матэрыяльную, чалавек атрымае, калі дзякуючы фізічным практыкаванням будзе паляпшаць сваё здароўе і не траціцца на лекі.

У прыватнасці, у кожным мікрараёне горада будуць устаноўленыя шчыты з інфармацыяй пра спартыўныя аб'екты — іх размяшчэнне, рэжым працы, расцэнкі для дзяцей і дарослых. Гэта, можа, адзін з пяцідзесяці магчымых кірункаў. Матэрыяльная база худа-бедна ўдасканальваецца. Аднак гэта будзе, прабачце, малпіна праца, пакуль мы не пераканаем чалавека, што трэба займацца фізічнай культурай. І канкрэтна чым.

Калі казаць пра школьную фізкультуру, то за апошні перыяд па ўмацаванні матэрыяльнай базы ў Гродне зроблена шмат. Тры гады таму забяспечанасць спартыўным інвентаром і абсталяваннем складала крыху больш за сорак працэнтаў, цяпер — ужо больш за семдзясят. Пазалетась у гэтую сферу накіравана 630 мільёнаў рублёў, у апошнім навучальным годзе — яшчэ 300 мільёнаў. Хоць я і не ўпэўнены, што заўсёды набываецца сапраўды на сто працэнтаў патрэбнае школам. Мажліва, ёсць сэнс арыентавацца не на агульнаўстаноўлены для кожнай навучальнай установы пералік інвентару і абсталявання (вялізны і цяжкавыканальны), а канкрэтна на праграмы абучэння. Ёсць, дапусцім, праграма па лёгкай атлетыцы — пад яе павінна быць матэрыяльная база. Трэба, мяркую, зрабіць перападлік усяго гэтага інвентару і абсталявання: што неабходна — пакінуць, а ад чагосьці, можа, і пазбавіцца.

А трэці ўрок фізкультуры, лічу, трэба ў школы вяртаць. Не ведаю, па якіх меркаваннях Міністэрства адукацыі ліквідавала трэці ўрок, але гэта ўдар па здароўі нацыі, які пакуль яшчэ можна не заўважыць, але які адаб'ецца літаральна праз чатыры-пяць гадоў. Так, гераічнымі намаганнямі настаўнікаў фізкультуры, за кошт секцыйных і спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў у суботу і нядзелю (якія, дарэчы, аплачваюцца такім мізэрам, што і казаць сорамна), мы спрабуем неяк кампенсаваць страту трэцяга ўрока фізічнага выхавання. Але ўсё гэта, так бы мовіць, выкрутасы, як ужо сказана вышэй, неабавязковыя.

Дарэчы, да скарачэння трэцяга ўрока ў горадзе было 220 настаўнікаў фізкультуры. На сённяшні дзень іх 175. Вядома, астатнім прапанавалі іншую працу, аднак ці тую, што яны хацелі — вялікае пытанне.

А вось праграмы, нарматывы па фізічным выхаванні, нягледзячы на меншую колькасць урокаў, засталіся ранейшымі. Здзіўляе і тое, што па гэтым прадмеце ў агульнаадукацыйных школах... няма падручніка. Па хіміі, матэматыцы, геаграфіі ёсць, а па фізкультуры, акрамя пачатковых класаў, адсутнічае. У нас што, няма каму напісаць падручнік, па якім бы дзеці вучыліся фізічнай культуры? Сёння маем толькі праграмы па класах, узросце, і не больш.

Упэўнены, што якасць фізічнага выхавання школьнікаў залежыць і ад укаранення ў вучэбны працэс тэхнічных сродкаў. Наспела пытанне, каб у кожнай школе ў распараджэнні настаўнікаў фізкультуры меліся камп'ютар, кінакамера, лічбавы фотаапарат, мультымедыйная сістэма. Скараціўшы трэці ўрок фізкультуры, мы павінны былі тэрмінова запоўніць гэты прабел іншымі варыянтамі працы, у тым ліку тэхнічнымі.

Мяркую, што Міністэрству адукацыі і Міністэрству спорту і турызму ёсць над чым сумесна папрацаваць. І тады ў нас не будзе праблем ні з наборам здаровых дзяцей у ДЮСШ, ні з вынікамі спартсменаў на міжнароднай арэне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Ад рэдакцыі. *Мы гатовыя прадоўжыць тэму, якая была закранутая за «круглым сталом» у Гродне. Запрашаем да абмеркавання ўсіх, каго яна хвалюе.*

Ключы да здароўя

ПАПЛАЧЦЕ, ПАЛЯГЧЭЕ

Здольнасцю плакаць мы надзелены ад нараджэння, але, пасталеўшы, лічым слёзы праявай слабасці. Ці трэба стрымліваць слёзы? Або, можа, наадварот — паплакаць часам карысна?

Плач — з'ява даволі распаўсюджаная ў прыродзе. Не толькі ў чалавека, але і ў жывёл ёсць слёзавыдзяленне. Але толькі Homo sapiens здольны праліваць эмацыйныя слёзы. Смутак, радасць або сум — нашы асаблівыя душэўныя станы выклікаюць слёзы, якія з'яўляюцца несвядомымі сігналамі таго, што нам патрэбна падтрымка або спачуванне.

Вока «плача» пастаянна

Слёзы на 98 працэнтаў складаюцца з вады. Але яны ўтрымліваюць у сабе яшчэ і тлушчавыя элементы, бялкі і вугляводы, слізь і антыбактэрыяльныя рэчывы. Слёзы ўвільгатняюць кан'юнктыву вока і абясшкоджваюць мікраарганізмы. Без слёз кан'юнктыва і рагавіца высахлі б і чалавек аслеп.

У год наш арганізм выпрацоўвае прыкладна паўлітра слёзнай вадкасці. Утвараецца яна ў залозах, размешчаных вакол кожнага вока. Пры марганні слёзная вільгаць размяркоўваецца па паверхні вока, а яе лішак трапляе ў слёзныя каналы. Іх два. Кожны размешчаны ва ўнутраным кутку вока і злучаецца са слёзным мяшком, які выходзіць у поласць носа. Менавіта таму падчас плачу ў нас не толькі вочы на мокрым месцы, але і нос.

Дык чаму ж мы плачам?

Слёзы бываюць фізіялагічнымі — гэта рэфлекторныя слёзы (патрэбныя для ўвільгатнення і ачышчэння вачэй) і эмацыйнымі. Рэфлекторныя слёзы таксама выдзяляюцца ў адказ на раздражняльнікі (напрыклад, рэфлекторнымі слёзамі мы плачам, калі рэжам едкую цыбулю).

Эмацыйныя слёзы ўзнікаюць як рэакцыя на эмацыйнае ўзрушэнне. Палягчэнне падчас такога плачу звязанае не з рыданнямі, а з хімічным складам слёз. У апошніх утрымліваюцца гармоны стрэсу, якія мозг выдзяляе падчас усплёску эмоцый. Такім чынам, праз слёзы, рэчывы, якія ўтвараюцца пры нервовым перанапружанні, пакідаюць наш арганізм.

Цікава, што так званыя светлыя слёзы мы льём часцей, чым горкія — ад цяжкіх падзей. Вадкасць, якая пры гэтым утвараецца, не выводзіць з арганізма шкодныя рэчывы, але змякчае дзеянне адрэналіну, колькасць якога пры ўзбуджэнні рэзка павышаецца. Дакладна такім жа механізмам дзеяння тлумачацца і слёзы, якія льюцца ад нястрымнага смеху. Пры гэтым салёнасць самых горкіх слёз — ад болю і ад адчаю — складае ўсяго 9 % ад салёнасці акіянскай вады.

Чаму жанчыны — плаксы?

Вучоныя даўно займаюцца вывучэннем «слёзнага» феномена. Яны вызначылі, што да 12 гадоў плачуць усе дзеці, а пасля — галоўным чынам дзяўчаткі. І прычына не толькі ў тым, што жанчыны нярэдка выкарыстоўваюць слёзы як зброю, сродак дыпламатыі і апошні аргумент у спробах дабіцца жаданага. Галоўныя віноўнікі — гармоны.

Слабы пол больш «слязлівы» з-за ўтрымання ў крыві гармону пралакціну, які адказвае не толькі за ўменне пускаць слязу, але і за выпрацоўку малака падчас кармлення грудзямі. А ў неплаксівасці мужчын «вінаваты» гармон тэстастэрон, які перашкаджае назапашванню слёзнай вадкасці.

Часткова эмацыйная скупасць мужчын абумоўліваецца і сацыяльнымі стэрэатыпамі. Што з маленства ўнушаюць бацькі хлопчыкам? Правільна. «Плакаць сорамна, ты ж мужчына!».

Плакаць карысна, але...

На думку спецыялістаў, людзі, якія не саромеюцца адкрыта выражаць свае эмоцыі, менш пакутуюць ад стрэсаў і лягчэй іх пераносяць. Таму пры нервовым перанапружанні зусім не шкодна даць сабе волю і «выліць» у плачы назапашаныя перажыванні.

Слёзы вымываюць з арганізма не толькі шкодныя гарманальныя субстанцыі, лішак солі, але і рэчывы, якія стымулююць стрэс. Стрымліваць слёзы і эмоцыі шкодна для здароўя. Нездарма ж мужчыны, якія плачуць у 4-5 разоў радзей, чым жанчыны, жывуць на 7 гадоў менш. Звычка заганяць перажыванні глыбока ўнутр можа абярнуцца цяжкімі парушэннямі нервовай сістэмы, гіпертаніяй, язвавай хваробай і да т.п. Аднак пры гэтым медыкі папярэджваюць, што слёзы прыносяць больш палёгкі ў тым выпадку, калі чалавек, які плача, знаходзіць эмацыйнае разуменне і суцяшэнне ў навакольных. Таксама яны рэкамендуюць плакаць не больш як 10 хвілін. Інакш замест заспакаення вы рызыкуеце атрымаць чырвоны нос, мяшкі пад вачамі і галаўны боль.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ЦІКАВА

Слёзы валодаюць і яшчэ адной цудадзейнай уласцівасцю — яны загойваюць раны.

У старажытных славян быў звычай: жанчыны збіралі свае слёзы ў спецыяльныя сасуды і змешвалі іх з ружавай вадой. Потым гэту сумесь прымянялі для лячэння ран. Гэтаксама рабілі і жанчыны Візантыі і Персіі, якія здаўна запрыкмецілі, што слёзы здольныя лячыць параненых воінаў.

Сакрэт просты: у слёзнай вадкасці ўтрымліваецца антымікробны бялок лізацым, які разбурае клетачныя абалонкі бактэрый і не дае ім выклікаць небяспечныя інфекцыі. Нездарма ж у казках слязам прыпісвалі сілу «жывой» вады. Варта прыгажуні тры дні праплакаць над загінулым каханым, як ён вяртаецца з царства мёртвых.

ДЗІЦЯ ЯК РЭЧ...

У Лунінцы ўстаноўлена 26-гадовая жанчына — забойца нованароджанага дзіцяці. Яна нарадзіла дзяўчынку абсалютна здаровую, гэта паказала экспертыза, і кінула дзіця ў выграбную яму. Потым з паслядовым пагаршэннем здароўя трапіла ў бальніцу, нараджала ж дома без кваліфікаванай дапамогі. Так стала вядома, што ёсць дзіця. Хоць гора-маці факт цяжарнасці і родаў адмаўляла да апошняга, а блізкім і суседзям гаварыла пра нейкую загадкавую пухліну, ад якой вырас жывот, следства аббергла такія цвярдзэнні.

Вядома, што абвінавачаная ў забойстве немаўляці замужам. Гадуе хлопчыка, якому пайшоў другі год. Яе старэйшую дачку чатырох гадоў выхоўваюць яе бацькі. Раней жанчына не мела праблем з законам, яна не п'яніца, не стаіць на ўліку ў псіхіятра. Цяпер суд будзе вырашаць яе далейшы лёс.

Яна СВЕТАВА.

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

9 июля 2010 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Условия аукциона	Целевое назначение	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ	Срок аренды (лет)	Ориентировочный размер затрат на подготовку документации, бел. рублей	Начальная стоимость, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей
1	пересечение ул. Ефремова – пр-та Космонавтов	340100000003002359	0,0024	ввод объекта в эксплуатацию до 19.11.2010 г.; установить экран размером согласно ПСД	установка рекламного светодиодного экрана	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети	5	1 500 000	259 830	25 000
2	ул. Ильича, в районе кинотеатра «Мир»	340100000007005658	0,0015		установка рекламного светодиодного экрана		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0010 га	5	1 500 000	151 620	15 000
3	ул. Ильича, в районе ПО «Гомельчанка»	340100000007005659	0,0024		установка рекламного светодиодного экрана		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0012 га	5	1 500 000	8 850	850
4	ул. Фрунзе	340100000001004695	0,0032		установка рекламного светодиодного экрана		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы, охранная зона подземной кабельной линии связи – 0,0008 га; водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы – 0,0024 га	5	1 500 000	216 410	21 000
5	ул. Свиридова	340100000002004762	0,5039		строительство магазина со встроенным кафе		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи, ливневой канализации – 0,1240 га; охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,0035 га	50	1 952 915	102 140 273	10 200 000

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 9 июля 2010 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина - легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням с 9.00 до 17.00 по 5 июля 2010 г. включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

ВНИМАНИЕ! Сообщаем о внесении изменений в извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле, опубликованное в газете «Звязда» 31 мая 2010 г.: с аукционных торгов, назначенных на 22 июня 2010 г., снят лот № 12.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by

ЯКІЯ БУДЫНКІ Ў БЕЛАРУСІ САМЫЯ СТАРЫЯ?

МАХЛЯРСТВЫ З АРЭНДАЙ МАШЫН

Дарагія аўтамабілі, якія бяруцца напракат, часам знікаюць...

Прычым, паводле звестак прэс-афіцэра Кастрычніцкага РУУС Сяргея Чабатарова, часта высвятляецца, што да крадзяжу «жалезных каней» маюць дачыненне менавіта арандатары, якія такім чынам хочуць палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Напрыклад, толькі ў Кастрычніцкім раёне сталіцы не так даўно было аб'яўлена ў вышук некалькі дарагіх аўто, якія людзі бралі напракат.

Так, БМВ, кошт якога складае 47 мільёнаў рублёў, хітрун арандаваў і выгнаў у Варонежскую вобласць Расіі. Машыну праваахоўнікі адшукалі пасля таго, як затрымалі прайдзісвета, які вярнуўся ў Беларусь, каб зноў «правярнуць» падобнае махлярства. Нахабніку цяпер пагражае да 10 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Яшчэ два дарагія аўтамабілі — «Таёта» за 87 мільёнаў рублёў і «Мерседэс» за 164 мільёны — зніклі пасля таго, як іх узялі ў арэнду двое грамадзян Абхазіі: праз некаторы час пасля гэтага машыны выкралі з розных стаянак. Апошні аўтамабіль адшукаўся ў Саратаўскай вобласці, а «Таёта» пакуль недзе «хаваецца». Між іншым, супрацоўнікі міліцыі цяпер правяраюць, ці маюць дачыненне да злачынства абхазцы, якія маюць від на жыхарства ў нашай краіне.

Акрамя таго, заведзена крымінальная справа на двух сяброў, якія бралі машыны на пракат, а потым іх перапрадавалі па танным кошце. Спачатку прайдзісветы змаглі «зарабіць» на арандаваным аўтамабілі «Аўдзі»: выставіўшы пакупніку цану ў «смешныя» 2500 долараў ЗША, яны прыдумалі гісторыю пра склад, які згарэў, і злосных крэдытораў, якія пагражаюць расправай, калі тэрмінова не будуць вернутыя грошы. Таму, маўляў, і такі танны кошт машыны. Да таго ж навярзлі сем корабаў калі дайшла справа да афармлення дакументаў на машыну: паабяцалі гэта зрабіць пасля таго, як бацька, на якога зарэгістравана аўто, вернецца з Германіі. А самі прадоўжылі тэрмін арэнды і пачалі траціць грошы. Схема аферыстам прыйшлася па душы, і ўжо праз дзесяць дзён яны ўзялі на пракат амаль новую «Аўдзі-А4», якую «спіхнулі» ў тры разы танней рэальнага кошту — за 11,5 тысячы долараў. «Легенду» выдалі падобную на вышэйзгаданую, толькі «пракалоліся», пакінуўшы ў бардачку дакументы на арэнду. Пакупнік, які іх знайшоў, зразумеў, што да чаго, і пасля нядоўгіх «перамоў» з махлярамі, якія паспелі патраціць частку выручаных за машыну грошай, патэлефанаваў у кампанію па пракаце аўтамабіляў, а тыя — ў міліцыю...

Ігар ГРЫШЫН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

1. Полацк. Сафійскі сабор, каля 1050 г. Найстарэйшы беларускі горад, які ўпершыню згадваецца ў летапісах у 862 годзе, трымае першынство і тут. Сафійскі сабор быў збудаваны ў прамежку між 1044-66 гадамі за князем Усяславам Чарадзеем. Перажыўшы колькі пажараў ды перабудоваў, храм датрываў ажно да XVIII стагоддзя, пакуль у Полацк не наведаўся рускі цар Пётр I.

— Добра выпіўшы, адзначаючы свае імяніны 29 чэрвеня 1705 года, Пётр з Меншыкавым і некалькімі афіцэрамі ўчынілі ў Сафіі крывавую расправу над уніяцкімі святарамі, — распавядае пісьменнік-гісторык Уладзімір Арлоў. — Манахаў, якія адмовіліся падпарадкавацца п'янаму грубіяну, засеклі шаблямі проста ў храме, а попел развеялі над Дзвіной... У Сафіі зрабілі вайсковы склад. Роўна 300 гадоў таму, 1 мая 1710 года, тут выбухнуў порах... На думку некаторых гісторыкаў, Пётр загадаў наўмысна знішчыць Сафію, каб пазбавіць беларусаў гэтай святыні...

У 1738-50-х гадах Сафію адбудаваў геніяльны Ян Глаўбіц — не ў першасным выглядзе, а ў вынайдзеным тады стылі віленскага барока. Глаўбіц максімальна захаваў рэшткі сцен і апсіды, уключыўшы іх у новы храм, сіметрычна паўтарыўшы з іншага боку. Сёння гэтая дзевяціметровая апсіда, якую можна агледзець з сярэдзіны Сафіі — найстарэйшая мураваная пабудова ў Беларусі. Дарэчы, літаральна гэтымі днямі Сафія зачыняецца на рэстаўрацыю: заменяць дах, вокны. На час працаў турыстам усярэдзіну ўваходу не будзе. Аднак, хто прыедзе ў Полацк у гэты перыяд, майце на ўвазе: рэстаўратары пакінулі колькі кавалкаў старажытнай апсіды незатынкаванымі звонку: калі стаяць тварам да ўваходу ў храм, іх можна пабачыць з правага боку, проста на дварэ.



2. Віцебск. Дабравешчанская царква, 1120-30-я гг. Менавіта такія даты часта сустракаюцца ў энцыклапедыях. Аднак аўтарытэтная даследчыца архітэктуры Тамара Габрусь лічыць, што Дабравешчанская царква нават старэйшая за Спаса-Еўфрасіннеўскую ў Полацку! І што памылкова — адносіць яе да Полацкай школы дойлідства, а выпадае казаць якраз пра перайманне архітэктуры гэтага храма!..



Царква неаднаразова перабудоўвалася, а ў 1961 годзе камуністы знішчылі ўнікальны помнік. Спачатку дакладна абмералі і сфатаграфавалі, а пасля ўзарвалі... У незалежнай Беларусі, у 1992 годзе, царква была адноўленая, у яе ўключаныя захаваныя старажытныя сцены вышынёй да некалькіх метраў, якія можна пабачыць як з сярэдзіны храма, гэтак і звонку — іх абачліва не затынкавалі.

3. Полацк. Спаса-Еўфрасіннеўская царква, між 1128 і 1150 гг. Гэты храм — найстарэйшы ў Беларусі будынак з тых, што захаваліся амаль у першасным выглядзе. Яго між 1128 і 1156 гадамі збудаваў дойлід Іаан на замову Святой Еўфрасінні Полацкай, унучкі Усяслава Чарадзея. Царква пасля пабудовы стала саборным храмам Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У ёй была келля Найпадобнай Еўфрасінні, якая цудоўна захавалася да нашых дзён. Засталіся ў царкве і ўнікальныя фрэскі, якім больш за сем стагоддзяў! Адметна, што літаральна ў мінулым месяцы ў Полацку ўсталявалі помнік дойліду Іаану, а новы праспект горада назвалі яго імем.

4. Гродна. Барысаглебская царква (Каложа), да 1183 г. Збудаваная ў другой палове XII стагоддзя, да 1183 года (першая згадка) на высокім правым беразе Нёмана побач з Замкавай гарой. Гэта і загубіла Каложу: 2 красавіка 1853 года палова храма абрынулася ў Нёман... На мяжы XIX і XX стагоддзяў царкву аднавілі: знішчаную частку выканалі з дрэва. Так храм выглядае і сёння. І гэта вельмі арыгінальна: кожны чалавек можа пабачыць на свае вочы пакручастую гісторыю гэтага ўнікальнага храма. Цяпер ідуць дэбаты, як аднаўляць Каложу: ці проста паднавіць драўляную частку, ці дабудоўваць з цэглы? Мяркую, апошні варыянт проста знішчыць гэтую непаўторную адметнасць... Між іншым, з XII стагоддзя захавалася шмат мазаічных крыжоў на сценах, выкладзеных з валуноў ды каляровых маёлікавых плітак: ёсць да чаго дакрануцца!..

5. Камянец. Белая вежа, між 1276 і 1288 гг. Вежа — помнік абарончага дойлідства, збудаваная паміж 1276 і 1288 гадамі на пагорку, які быў абнесены валам з драўлянымі ўмацаваннямі. Вышыня вежы 30 метраў (як дзевяціпавярховы дом!), дыяметр — 13,5 метра, таўшчыня сцен — 2,5 метра. Вежа збудаваная з чырвонай і жоўтай цэглы. «Белай» яе назвалі толькі ў XIX стагоддзі расійскі гісторык Карцаў і мясцовы святар Паеўскі, якім чамусьці падалося, што вежу раней бялілі. Аднак дакументальных сведчанняў гэтага няма.

Цалкам белай вежа зрабілася ў сярэдзіне XX стагоддзя, за савецкім часам. Мясцовыя ўлады рыхтаваліся да чарговых святаў і вырашылі перастрахавацца, пабяліўшы вежу: каб розныя камісіі і дэлегацыі не дачапіліся да «не таго» колеру сцен... Адмылі вежу ўжо ў незалежнай Беларусі брэсцкія альпіністы і камянецкія ратаўнікі, аднавіўшы гістарычную справядлівасць.

6. Наваградак. Замак, сярэдзіна XIII ст. Наваградак — першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Тут у 1253 годзе каранавалі князя Міндоўга. Выходзіць, што замак пачаў будавацца раней за гэтую дату, недзе ў сярэдзіне XIII стагоддзя. Паводле іншых звестак, каранацыя была яшчэ ў драўляным замку.

Замак не страчваў свае абарончае функцыі ажно да 1710 года, калі яго спалілі шведы... Да сёння дайшлі рэшты толькі дзвюх вежаў (усяго было сем). Цэнтральная, або Шчытавая — тая, што захавалася найбольш, можна агледзець яе мур, вокны, байніцы. Другая захаваная частка належыць вуглавой альбо касцельнай вежы — бо знаходзіцца найбліжэй да Фарнага касцёла.

Якраз цяпер ідзе дыскусія, якім чынам кансерваваць ці аднаўляць Наваградскі замак. Зразумела, што «дабудоўваць» яго нельга — гэта парушыць усе прынятыя ў свеце правілы захавання помнікаў архітэктуры. Аднак меры прымаць трэба, бо без кансервацыі замак можа быць страчаны. Таму нядаўна Міністэрства культуры пастанавіла ўсе сродкі ад латарэі «Скарбніца» пускаць на аднаўленне замка. Кошт латарэйкі роўны кошту цаглін. Дык пакладзем жа кожны па сімвалічнай цаглінцы на аднаўленне Наваградскага замка!

7. Ліда. Замак, 1323 г. Лідскі замак будаваў у 1323-28 гг. Князь Гедымін. Цягам некалькіх стагоддзяў гэта была наймагутнейшая крэпасць на заходніх землях Беларусі.

Замак вытрымаў шмат аблогаў, у выніку чаго сцены былі пашкоджаныя, а вежы і ўнутраная забудова знішчаныя цалкам. Аднак большая частка сценаў выстаяла: не дзіўна, бо яны маюць больш за 12 метраў вышыні і да 2 метраў таўшчыні!

Ужо колькі дзесяцігоддзяў замак аднаўляецца. Прычым спачатку аднаўленне ішло з няякаснай цэглы, якую цяпер давялося разабраць. Сёлета ў Лідзе адбудуцца «Дажынкі» — дзеля гэтага на замак вылучаныя значныя сродкі. Ёсць спадзяванне, што Лідскі замак нарэшце паўстане ва ўсёй сваёй велічы і харастве!..

8. Крэва (Смаргонскі раён). Замак, да 1338 г. Крэўскі замак, збудаваны каля 1338 года, — сакральнае месца для Беларусі і былой Літвы: тут вырашаўся лёс усяе Еўропы, што сведчыць пра нашу непарыўную супольную гісторыю і значнасць нашай зямлі. У вежы замка (якая часткова захавалася) 15 жніўня 1382 года па загадзе Ягайлы быў задушаны ягоны дзядзька, князь Кейстут (каб не дове замка сапраўды было правіла, што кожны, хто праязджаў праз мястэчка, мусіў прывезці камяні на замак, спаганялі і з мясцовых жыхароў.

Нават закінуты, Крэўскі замак ураўвае сваімі 12-метровымі сценамі, якія маюць таўшчыню да 2,5 метра. Хочацца верыць, што разам з аднаўленнем іншых замкаў (Мір, Нясвіж, Косава, Ружаны, Наваградак, Ліда) — дойдуць рукі і сюды. Крэўскі замак мусіць быць гонарам нашай краіны!

9. Уселюб (Навагрудскі раён). Касцёл Святога Казіміра, да 1433 г. Збудаваў касцёл ва Уселюбе Ян Няміра, канюшы Вялікага княжацкага двара. З вядомай даты вынікае, што гэта — самы стары касцёл Беларусі. Аднак храм быў значна перабудаваны ў XIX стагоддзі — прынамсі вежа ў сённяшнім выглядзе з'явілася менавіта тады...

Першапачаткова касцёл ва Уселюбе будаваўся як каталіцкі храм Яна Хрысціцеля. Ад 1576 па 1642 год з'яўляўся кальвінскім зборам, пасля зноўку стаўся касцёлам і быў асвечаны ў імя Святога Казіміра.

У 1986 годзе касцёл моцна пацярпеў ад пажару, быў адноўлены ў 1988 годзе.

Уселюбскі касцёл — найбольш ранні ўзор готыкі ў мураваным каталіцкім будаўніцтве ў Беларусі.

10. Ішкалдзь (Баранавіцкі раён). Траецкі касцёл, да 1472 г. Гэты храм — самы стары ў Беларусі касцёл з тых, якія не былі перабудаваныя. Першая згадка — 1472 год. Гэта значыцца, што да таго часу касцёл ужо быў — і, верагодна, можа памятаць нават Вітаўта Вялікага!

Пашкоджаны храм быў толькі аднойчы — у часе вайны з Масковіяй 1654-57 гадоў. Як і касцёл ва Уселюбе, у другой палове XVI стагоддзя гэты храм быў прыстасаваны пад кальвінскі збор, у 1641 годзе вернуты каталікам. Пасля паўстання Каліноўскага, як і многія касцёлы, імперскія ўлады аддалі Ішкалдзь... На гатычны касцёл начапілі недарэчную цыбуліну...

Унутранае ўбранне храма ў выніку перадачаў у розныя веры не захавалася. Аднак тут можна пабачыць цікавы вітраж найноўшага часу: людзі, якія едуць у чорнай машыне. Ксёндз Мацей ахвотна распавядае кожнаму, што гэта — рэальная гісторыя. За савецкім часам сюды прыехалі НКУСаўцы зачыняць і руйнаваць храм, але людзі літаральна на каленях пераканалі гэтага не рабіць. Другі наступ быў яшчэ больш брутальны: прыгналі тэхніку, бульдозеры. Тады вернікі леглі проста пад колы. Начальнік загадаў кіроўцу ехаць — проста па людзях. Аднак кіроўца выскачыў і сказаў: «Хочаш — едзь сам, я па людзях не паеду!» Гэтую гісторыю старыя жыхары пераказваюць і цяпер.

А яшчэ ксёндз Мацей апавядзе вам трагічную гісторыю ксяндза Вінцэнта Латарэвіча. У 1919 годзе камуністы патрабавалі, каб ксёндз выракся веры. Святар адмовіўся. За гэта 19 сакавіка 1919 года яго жорстка забілі — адвезлі ў Мір, адсеклі галаву і выкінулі ў замкавую студню. Вернікі цішком выцягнулі забітага ксяндза і пахавалі каля Ішкалдскага касцёла...

...Дарэчы, знайсці Ішкалдзь лёгка. Многія бачылі на Брэсцкай трасе агромністую скульптуру зубра на мяжы трох абласцей — Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай. Дык вось, Ішкалдзь знаходзіцца літаральна некалькі кіламетраў управа (калі ехаць з Мінска). Аднак патрапіць туды можна толькі праз старую брэсцкую трасу, таму ўзбройвайцеся мапай!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара і Андрэя ДЫБОЎСКАГА.

МАЙ НА ЎВАЗЕ

З рознымі агаворкамі (дзе руіны, дзе падмурак...) да спіса можна дадаць:

❑ Геранёны (Іўеўскі раён). Руіны замка, канец XV—пачатак XVI ст. На вялікі жаль, усё, што засталося ад замка, — невялікія кавалкі вежаў 1-2 метры ў вышыню...

❑ Брэст, археалагічны музей «Бярэсце», рэшткі драўлянай забудовы XI—XIII ст. Захаваліся пабудовы са сценамі да 7-12 вянцоў.

❑ Гродна. Стары замак, XII—XIX ст. Ад першапачатковага замка ацалелі толькі падмуркі і часткі сцен, іншае пабудавана значна пазней.

❑ Наваградак. Фарны касцёл, капліцы пачатку XVст. Касцёл у сённяшнім выглядзе пабудаваны ў 1712-23 гг. Аднак у яго аб'ём уключаныя тры ранейшыя капліцы пачатку XV стагоддзя. Дарэчы, у гэтым касцёле 12 лютага 1799 года быў ахрышчаны Адам Міцкевіч.

❑ Тураў (Жыткавіцкі раён). Падмуркі царквы 1170-х гг. Гэтая царква з'яўлялася самай буйной мураванай пабудовай на тэрыторыі заходніх земляў старажытнай Русі. Мела даўжыню 29,3 метра, шырыню 17,9 метра. Знішчаная землятрусам 3 мая 1230 года. Цяпер падмуркі расчышчаныя, над імі збудаваны павільён, кожны ахвотны можа агледзець унікальную рэліквію.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» шчыра віншуе з узяццем шлюбу сваю супрацоўніцу Тацяну ПРУС і яе мужа Аляксея. Жадаем новай маладой сям'і дружнага і шчаслівага жыцця на доўгія гады!

Гучная справа: працяг тэмы

«БЫЛІ МАЦЮКІ, УДАРЫ ПА ГОЛЫМ ЦЕЛЕ. ГЭТА НЕВЫНОСНА БЫЛО ЧУЦЬ...»

Прозвішчы кантралёраў вядомыя. Чаму ім не могуць прад'явіць абвінавачванні?

Пра грубыя парушэнні закона, якія дапусціла ў 2002 годзе следства, не ведае, напэўна, толькі лянівы.

Напрыклад, у першай судова-медыцынскай экспертызе не былі зафіксаваныя... пераломы носа, некаторых рэбраў. І калі б не фотаздымкі трупа, якія зрабілі сваякі, пра траўмы многія б і не даведаліся.

Вопратка, якая належала Дзянісу Клімачову, увогуле знікла. Хоць яна і была пазначана ў апісанні судмедэксперта.

Фігуранты крымінальнай справы, супрацоўнікі СІЗА-5, сцвярджалі, што рэбры Дзянісу Клімачову яны зламалі, калі рабілі масаж сэрца. Але зноўку відавочная нестыкоўка: «хуткую дапамогу» тады ніхто не выклікаў.

З моманту злачынства мінула амаль дзевяць гадоў, а яго ўдзельнікі дагэтуль на волі. І добра, калі за гэты час яны не знявечылі яшчэ кагонебудзь.

Чаму вінаватых не могуць выявіць? Магілёўская абласная пракуратура сутыкнулася з праблемай. Фактычна імёны тых, хто адчыняў камеру Дзяніса Клімачова і мог удзельнічаць у збіцці, вядомыя. Але ў адносінах да некаторых крымінальная справа за перавышэнне службовых паўнамоцтваў ужо заводзілася, і тады ім адказнасці ўдалося пазбегнуць. А па беларускім заканадаўстве крымінальная справа не можа быць заведзена ў адносінах да асобы, якая мае прысуд па тым жа абвінавачванні.

Але пакараць вінаватых, прынамсі некаторых, магчыма. Напрыклад, існуе пастанова Пленума Вярхоўнага суда за 16 снежня 2004 года. У дакуменце пазначана, што службовыя асобы, якія не сталі перашкаджаць злачынству (а такія ў гісторыі Клімачова ёсць), лічацца саўдзельнікамі і павінны адказваць на роўных з тымі, што непасрэдна чынілі злачынства. Але, каб скарыстацца гэтым законам, патрэбна адвага.

Спадзяёмся Магілёўская абласная пракуратура зможа выявіць вінаватых у збіцці Дзяніса Клімачова.

ГЕНПРАКУРАТУРА працягвае настойваць на пакаранні кантралёраў бабруйскага СІЗА-5. Пасля іх удараў загінуў 29-гадовы Дзяніс Клімачоў, які трапіў у следчы ізалятар усяго на тры месяцы. Я сустрэўся з галоўнай сведкай злачынства. У тую ракавую ноч Надзея Хрушчынская сядзела ў суседняй камеры, чула, як здзекуюцца з вязня ашалелыя кантралёры. Некаторых яна разгледзела ў прыадчыненую «кармушку».

Хоць справа і расследуецца амаль дзевяць гадоў, кантралёраў у чарговы раз не змаглі прыцягнуць да крымінальнай адказнасці. Нагадаем, што Дзяніс Клімачоў загінуў пасля таго, як яго збілі ў бабруйскім СІЗА-5. Крымінальную справу праводзілі несумленна, але Генеральная пракуратура выявіла прынцыповую настойлівасць — пярэваратні ў пагонах павінны адказаць за злачынства.

У нумары «Звязды» за 11 снежня 2009 года мы пісалі пра тое, што Магілёўская абласная пракуратура ў чарговы раз завяла справу па артыкуле 426 Крымінальнага кодэкса («Перавышэнне ўлады ці службовых паўнамоцтваў»). Падавалася, што службовых асобаў, якія збівалі Клімачова, выявяць, але зноўку да крымінальнай адказнасці ніхто не прыцягнуты не быў.

У сувязі з гэтым рэдакцыя «Звязды» атрымала афіцыйны каментар на рашэнне абласной пракуратуры прыпыніць справу.

«У Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь праверана законнасць і абгрунтаванасць гэтага рашэння, — паведамляе **начальнік аддзела па наглядзе за следствам у органах пракуратуры Ігар СЕЎРУК.** *— Рашэнне аб прыпыненні папярэдняга следства па справе адменена ў сувязі з непаўнатой праведзенага следства. Справа накіравана ў пракуратуру Магілёўскай вобласці для правядзення дадатковага следства».*

Такім чынам, кропка ў гучным і даўнім злачынстве не пастаўлена. Але сваякі Дзяніса Клімачова баяцца, што з такімі тэмпамі тэрмін прыцягнення да крымінальнай адказнасці па артыкуле 426 сыдзе.

— Справу расследуюць амаль дзевяць гадоў. З самага пачатку мне сказалі, што я нічога не даб'юся, што такое наша жыццё і трэба змірыцца. З самага пачатку мяне запэўнівалі крымінальнай адказнасцю за дачу ілжывых паказанняў, — узгадвае Алена АБРАМОВІЧ, стрыечная сястра загінулага. *— Сёння ў мяне застаецца мала надзей на тое, што вінаватых атрымаецца пакараць. Не за гарамі той час, калі тэрміны прыцягнення да крымінальнай адказнасці сыдуць.*

Яны тупалі нагамі: «Ту-ту, паехалі, цягнік прыехаў!» Смяяліся, піхалі. Было невыносна чуць гэтыя здзекі. Мы паднялі крык: «Што вы робіце, што гэта такое?» Пасля гэтага кантралёры прыадчынілі нашу «кармушку». І ў шчыліну я пабачыла тых, хто быў на калідоры.

Дзяніс КЛІМАЧОЎ (злева) трапіў у СІЗА ўсяго на тры месяцы. Пасля збіцця «нявызначанымі супрацоўнікамі ізалятара» мужчына загінуў.

ХРОНІКА ЗЛАЧЫНСТВА

Дзяніс Клімачоў раптоўна загінуў у бабруйскім СІЗА-5 у ноч з 19 на 20 снежня 2001 года. Справу хутка прыкрылі. Судмедэксперты «высветлілі», што 29-гадовы мужчына памёр з-за... недахопу алкаголя ў арганізме (кардыяпатыі алкагольнага генезу).

Тым часам на труп Дзяніса перад пахаваннем не маглі нацягнуць штаны: цела было знявечана шматлікімі траўмамі — гематомамі, пераломамі. Спачатку судмедэксперты сцвярджалі, што 33-35 удараў па целе Клімачоў... нанёс сабе сам. І гэта ў камеры для неспакойных, дзе сцены абшыты гумай.

Сваякі знайшлі ў сабе смеласць сфатаграфаваць труп і пачаць дабівацца праўды. Сталі вядомыя новыя страшныя факты. Пасля дадатковых экспертызаў высветлілі, што мужчына атрымаў не менш за 33 удары па целе тупым прадметам.

Аднак да крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты толькі двое — начальнік медыцынскай службы СІЗА-5 і дзяжурны памочнік начальніка следчага ізалятара. Яны атрымалі ўмоўныя тэрміны за «несвоечасовае аказанне дапамогі». Але чаму не пакаралі непасрэдных фігурантаў, якія збівалі Дзяніса?

Сваякі звярнуліся да журналістаў. Пасля публікацый у прэсе была распачата новая крымінальная справа. Толькі ў кастрычніку 2008 года кантралёр Мазгавой, пры ўдзеле якога адчынялі камеру № 39, быў прызнаны вінаватым у «бяздзеянні службовай асобы», але не трапіў у турму з-за сканчэння тэрмінаў прыцягнення да крымінальнай адказнасці.

Пасля серыі публікацый у «Звяздзе» Генпракуратура ў чарговы раз запатрабавала ў Магілёўскай абласной пракуратуры выявіць вінаватых. Адзін са следчых, які расследаваў справу раней, атрымаў дысцыплінарнае спагнанне за цяганіну. Справу перадалі іншаму спецыялісту. Застаецца апошняя надзея.

«Раптам чуем крыкі: «Ты што, б.., хацеў мне нябожчыка на змену перадаць?»

У 51-гадовай жыхаркі Бабруйска Надзеі Хрушчынскай — цяжкая стадыя ракавага захворвання. Двойчы на дзень да яе прыходзіць медсястра і робіць абязбольваючыя ўколы.

Па шчырасці, не хочацца верыць, што следства зойдзе ў тупік з-за «сканчэння тэрмінаў». Пра збіццё Дзяніса Клімачова ведаюць многія, і калі пярэваратні ў пагонах застануцца на волі, гэта будзе знішчальнае фіяска праваахоўнай сістэмы. Іначай што атрымліваецца? Грамадзянін можа пацярпець ад супрацьзаконных дзеянняў міліцыянера ў пагонах, а злодзей за гэта не адкажа?

Тым часам надзея на асуджэнне былых кантралёраў СІЗА-5 яшчэ не згасла. Тым больш што галоўная сведка злачынства цвёрда і адважна дае паказанні. У снежні 2001 года жанчына знаходзілася ў лічаных метрах ад месца, дзе ашалелыя кантралёры здзекаваліся з Дзяніса Клімачова.

Тады, у 2001 годзе, жанчына ўпершыню трапіла ў следчы ізалятар. Ноч з 19 на 20 снежня яна памятае, нібы гэта здарылася ўчора.

—Такое не забудзеш, — запрашае мяне Надзея Фёдараўна прысесці на старэнькі фатэль. *— Тады ў мяне памерла маці, я страшна перажывала. Да таго ж я чакала свайго прысуду: следчы не стаў разбірацца ў маёй сітуацыі, хоць нават пацярпелы цвердзіў, што я невінаватая, мне ўсё адно шылі справу... Да ўсяго яшчэ і гэтае жахлівае здарэнне.*

— Што адбылося ў бабруйскім СІЗА-5 у ноч з 19 на 20 снежня 2001 года?

— Ён (Дзяніс Клімачоў, — **Я.В.***) быў у суседняй камеры № 39. Калі ісці па калідоры, наша камера № 37 была апошняя па левым баку, яго — апошняя прама. Адлегласць паміж дзвярыма — меншая за метр. Там шэптам скажы — усё чуваць. А тут чалавек крычаў усю ноч, клікаў нейкую Ларысу. Відавочна, што ў хлопца дах паехаў. Першы раз у турме, не трэба быць алкаголікам ці наркаманам, каб гэта здарылася. Калі ён крычаў адзін, мы асабліва не пратэставалі. Але тое, што адбылося пасля, перапужала ўсіх.*

Яго вывелі на калідор. Яны пачалі здзекавацца. Пачалі праганяць яго скрозь строй. Было ўражанне, што, як мячык, перакідалі з боку ў бок. Гэта былі не плескачы, а ўдары па голым целе. Падлога там была засланая лістамі бляхі. Было чуваць, як ён бег, спатыкаўся, яго вярталі, зноў удары...

— За што яго білі?

— Ён іх вывеў з цярпення, такімі мацюкамі брудным яго крылі, што вушы вялі. Такі шум стаяў, што падыходзілі іншыя дзяжурныя, пыталіся: «Што ў вас тут адбываецца?» «Вось, дурня вывелі, спаць не дае». А ён крычаў розную лухту і плакаў, і прасіўся, клікаў Ларысу. Пры гэтым не грубіў, а прасіў дапамогі. А яны тупалі нагамі: «Ту-ту, паехалі, цягнік прыехаў!» Смяяліся, піхалі. Было невыносна чуць гэтыя здзекі. Мы паднялі крык: «Што вы робіце, што гэта такое?» Пасля гэтага кантралёры прыадчынілі нашу «кармушку». І ў шчыліну я пабачыла тых, хто быў на калідоры. Адразу ж пазнала здаровага паставога Сашу, які тады дзяжурыў на паверсе. Рэчы Дзяніса чамусьці валяліся ў куце, не ведаю, чаму іх вывалаклі. Потым гэты шум сціх.

Гэта былі не плескачы, а ўдары па голым целе. Падлога там была засланая лістамі бляхі. Было чуваць, як ён бег, спатыкаўся, яго вярталі, зноў удары...

— Калі вы зразумелі, што хлопец з суседняй камеры загінуў?

— Прыкладна а 8-й раніцы змену прымаў кантралёр Коля. Яны яму пра забітага кажуць: «Ай, ён спіць, нават есці не браў, не чапай яго». А Коля ім: «Ты мне адамкні, я хачу паглядзець». Раптам чуем крыкі, мацюкі: «Ты што, б.., хацеў мне нябожчыка на змену перадаць?» Там жа рады не рады, а ўсё чуеш. І тут пачалася бегаціна, мацюкі, размовы, усё на вушы стала...

Шакіраваны аповедам Надзеі Фёдараўны яшчэ раз перапытваю: няўжо яна так добра памятае ўсе дэталі?

—Так, і да апошняга буду казаць праўду. Калісьці ў мяне забілі брата, і калі яны здзекаваліся з гэтага хлопца, я нібы наноў усё ўзгадала. Гэта ўсё пакінула страшны адбітак. Нават іншыя жанчыны з камеры, якія многае пабачылі за жыццё, не вытрымалі, крычалі...

Дададзім, што словы Надзеі Хрушчынскай былі пацверджаныя следчым экспериментам.

Яўген ВАЛОШЫН,
загадчык аддзела журналісцкіх расследаванняў «Звязды».

ПІЦЕ, ДЗЕЦІ, МАЛАКО!

Па сталічных вуліцах «хадзіла» згушчанае і дзіцячае малако

Рэспубліканскі фестываль малака прайшоў у Мінску.

Ва ўсім свеце Дзень малака прынята адзначаць 1 чэрвеня, і ўжо каля 50 краін прынялі малочную эстафету, у тым ліку і Беларусь. 6 чэрвеня на пляцоўцы каля Палаца спорту прыхільнікаў малочнай прадукцыі было шмат цэлы дзень — па папярэдніх падліках, кірмаш наведала каля дзесяці тысяч дэгустатараў. На такіх мерапрыемствах людзей прывабліваюць шырокі асартымент, нізкія цэны. Для вытворцаў гэта таксама добрая магчымасць заявіць ці нагадаць пра сябе. Свае палаткі на пляцоўцы выставіла дванаццаць малочных гігантаў краіны.

Акрамя выставы-кірмашу і дэгустацый, мінчане і госці сталіцы маглі паўдзельнічаць у цікавай забаўляльнай праграме.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 08 июля 2010 г. в 11.30 состоится ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности предприятию ОАО «Весоприбор», в составе Лота № 1:

Наименование имущества, входящего в состав лота:	**Комплекс зданий и сооружений с зелеными насаждениями, расположенный по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Вишневский с/с, около д. Доманово, в составе:** **- кап. строение с инв. № 710/С-50814 (здание пищеблока) общ. пл. 75,60 кв.м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-50815 (погреб) общ. пл. 9,8 кв.м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-50816 (уборная) общ. пл. 4,2 кв.м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-54663 (навес) площадью 14,0 кв.м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-54670 (летний душ), общ. пл. 5,7 кв.м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-54662 (артезианская скважина) глубиной 40 м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-54665 (водопроводная сеть) протяженностью 136,6 м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-54669 (воздушная линия) протяженностью 92,55 м;** **- кап. строение с инв. № 710/С-54664 (наружное освещение) протяженностью 144,65 м;** **- зеленые насаждения (деревья, кустарники).**
Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54**
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Начальная цена продажи, рублей без учета НДС	**54 946 149**
Размер задатка, рублей	**5 494 600**
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810
Площадь земельного участка	**0,2450 га** – кадастровый № 720881200001000182, правовой режим – пост. пользование; **0,0197 га** – кадастровый № 720881200009000002, правовой режим – пост. пользование
Характеристика объектов	**здание пищеблока,** одноэтажное, кирпичное, 1992 г.п, фундамент бетонный, перекрытия деревянные, кровля шиферная, полы бетонные; **погреб,** одноэтажный, заглубленный, кирпичный, 1997 г.п., фундамент кирпичный, перекрытия – ж/б плиты, кровля – земляная насыпь, полы бетонные; **уборная,** одноэтажная, кирпичная, 1992 г.п., фундамент кирпичный, стены кирпичные, перекрытия отсутствуют, кровля металл., полы дощатые; **навес,** одноэтажный, открытый с 4-х сторон, фундамент металл. столбы, крыша шиферная, полы бетонные; **летний душ,** одноэтажный, металлический, фундамент металл. столбы, стены металл., перекрытия отсутствуют, крыша отсутствует, полы бетонные; **зеленые насаждения:** клен остролистный (18 шт.), тополь (13 шт.), яблоня (21 шт.), груша (3 шт.), груша дичка (1 шт.), береза (8 шт.), сосна (5 шт.), дуб (1 шт.), ива плакучая (1 шт.), липа (3 шт.), осина (2 шт.), кустарник – кизильник (22 шт.)
Условия продажи	аукцион без условий
Срок заключения договора купли-продажи	в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	**по 07 июля 2010 г. включительно**

Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить: заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (рус.) язык; **представителям юр. и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае, если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ДАІ Беларусі ўвядзе новую вадзіцельскую катэгорыю

Новая катэгорыя «АМ» будзе распаўсюджвацца на мапеды, скутары і іншыя падобныя транспартныя сродкі. Як паведаміў журналістам начальнік УДАІ МУС падпалкоўнік Юрый ЛІТВІН, падрыхтоўчыя мерапрыемствы па гэтым пытанні ідуць узмоцненымі тэмпамі.

— Рабіць гэта мы будзем на добраахвотнай аснове. Калі чалавек захоча, то такую магчымасць яму дадзім. Аднак здаваць экзамены ў ДАІ для атрымання правоў новай катэгорыі ў абавязковым парадку не спатрэбіцца, — падкрэсліў Літвін.

Акрамя таго, калі чалавек ужо мае катэгорыю «А» ці «В», то пры жаданні ён зможа атрымаць і катэгорыю АМ, для гэтага будзе дастаткова напісаць заяву. Як адзначыў Літвін, усе нюансы ў гэтым пытанні павінны быць завершаныя да канца снежня. Прыблізна з гэтага часу і пачнецца выдача вадзіцельскіх правоў новай катэгорыі.

Ілья ЛАПАТО.

Погляд эканаміста

Малая аграрная палітыка

Як стымуляваць развіццё падсобных гаспадарак — тэма гутаркі нашага карэспандэнта з вядомым эканамістам і аналітыкам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. Заікам.

— Чаму кіраўніком дзяржавы на нядаўняй нарадзе па пытаннях развіцця асабістых падсобных гаспадарак грамадзян так востра былі агучаны існуючыя ў гэтай сферы праблемы? У прыватнасці, гаварылася пра неабходнасць распрацаваць дакладную, зразумелую вяскоўцам праграму па падтрымцы і развіцці асабістых гаспадарак да 2015 года. Якія тут прычыны галоўныя: палітычныя, эканамічныя ці сацыяльныя?

— Я думаю, што тут сутнасць вось у чым. Перадумовы для такой нарады наспелі. У сельскай гаспадарцы мы можам штогод прыбаўляць ды і прыбаўляем на 5-6 працэнтаў. І адначасова штогод прыкладна на 5-6 працэнтаў зніжаецца вытворчасць сельгаспрадукцыі ў асабістых падсобных гаспадарках. І гэта адмоўная тэндэнцыя назіраецца даўно. Каб яе пераламаць, надаць імпульс вядзенню вясковага падворку ў новых умовах і была склікана гэта нарада. Пра вострыя праблемы і гаварыць трэба прама, канкрэтна і задачы ставіць дакладныя і рэальныя. Агульнавядома, што вясковае насельніцтва няўхільна старэе, а моладзь не вельмі імкнецца заняць месца старэйшых на прысядзібным участку, у хляве, даглядаць кароў, бычкоў, свіней, птушку. Мы павінны распрацаваць малую аграрную палітыку па падтрымцы вяскоўцаў з талентам гаспадара, уласніка ў лепшым сэнсе гэтага слова. Калі не прыняць цяпер рашучых мераў, то наш сектар асабістых гаспадарак паступова знікне.

— Калі такое і здарыцца, то не хутка. Глыбінка, вядома, так проста не адмовіцца ад уласнага падворка. Але ці варта ўвогуле трымацца абедзвюма рукамі за падсобныя гаспадаркі? Што яны могуць у параўнанні з буйнымі, выдатна абсталяванымі агракамбінатамі, комплексамі, птушкафабрыкамі, фермамі?

— Што і хто б там ні казаў на гэту тэму, а крызіс усё паставіў па месцах. У прыватнасці, ён яшчэ раз паказаў, што вялікае прадпрыемства яшчэ не значыць эфектыўнае, што ў эканоміцы памер мае значэнне. Давайце паглядзім, што ўяўляе падсобны падворак краіны ў рэгіёнах. Там склаліся свае прапорцыі і яны, на мой погляд, даволі цікавыя. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці ў асабістых гаспадарках утрая менш кароў, чым у аграрных прадпрыемствах. А вось па колькасці свіней розніца паміж імі ўжо нязначная, амаль парытэт. Прыкладна аднолькавая колькасць коней там і там. А вось па козах і авечках вясковае насельніцтва — бясспрэчны лідар. Гэтай жывёлы ў людзей у 5-6 разоў больш. Па вытворчасці гародніны і садавіны падсобныя гаспадаркі таксама ўдала канкуруюць з аграрным сектарам: 50 на 50.

А цяпер завітаем у Віцебскую вобласць і пацікавімся, як там справы з вытворчасцю малака? Яго ў падсобных гаспадарках вырабляецца ўдвая менш, чым у сельскагаспадарчых кааператывах. Гэта натуральна. Але звярніце ўвагу: як мінімум адну трэць у агульны надой вобласці складае ўнёсак насельніцтва. Для гэтага ў многім праблемнага рэгіёна неблагі паказчык. Прыкладна 20 працэнтаў абласнога паказчыка складае мяса, якое здае насельніцтва. А вось па яйках прадукцыйнасць падсобных гаспадарак амаль такая, як і ў птушкафабрыках — 40 працэнтаў усіх яек даюць прыватныя нясушкі.

Гродзенская вобласць на фоне іншых рэгіёнаў заўсёды вылучалася моцнымі падсобнымі гаспадаркамі. Яны там здаюць дзяржаве малака прыкладна адну чвэрць ад яго агульнай вытворчасці. Па яйках забяспечваюць палову абласнога паказчыка.

У паўднёвай Гомельскай вобласці, дзе выдатна растуць шматлікія сельгаскультуры, вясковае насельніцтва забяспечвае 90 працэнтаў вытворчасці бульбы. Вядома, што датычыцца збожжавых, то падсобным гаспадаркам тут цяжка ды і не трэба спаборнічаць з былымі калгасамі. А вось тое, што амаль 90 працэнтаў гародніны і садавіны на рынак пастаўляе насельніцтва і фермерскія гаспадаркі — цікавы факт. Я назваў толькі некаторыя лічбы. І што, загадаеце не заўважаць іх? Але гэта будзе недаравальнай памылкай, бо нават у неспрыяльных умовах асабістыя падсобныя гаспадаркі робяць важкі ўнёсак у стварэнне нацыянальнага багацця.

— Згодны, лічбы ўражваюць. Але як, на ваш погляд, дзяржава можа стымуляваць працэс калі не адраджэння, то, ва ўсякім разе, развіцця і вядзення беларускага падворка па-новаму?

— Садзейнічаць не на словах укараненню сучаснай агратэхнікі, тэхналогій, дапамагаць у барацьбе са шкоднікамі раслін, хваробамі жывёлы, вызваліць ад пут бюракратызму. І справа пойдзе. У нашага народа яшчэ захавалася цяга да зямлі. У паўднёвых раёнах краіны некаторыя гаспадары сядзібаў ужо вырошчваюць абрыкосы і персікі, якія да нас завозяць з суседніх Украіны і Малдовы. У нас тысячы вясковых сем'яў восенню могуць вас пачаставаць смачным вінаградам. Мяняецца клімат і нам нядрэнна было б выкарыстоўваць на сваю карысць яго пацяпленне для пасадак, геаграфічнага пашырэння засваення новых сельскагаспадарчых культур.

У нас адбудзецца выбух у вытворчасці мяса, калі нашы вяскоўцы пачнуць гадаваць в'етнамскіх свіней.

Увогуле важным складнікам будучай праграмы, пра якую казаў Прэзідэнт, павінен стаць раздзел аб дапамозе па ўкараненні новых перспектыўных пародаў жывёлы, гатункаў садавіны і гародніны менавіта на прысядзібных участках вяскоўцаў. Здолелі ж зрабіць гэта тыя з іх, хто сёння спецыялізуецца на масавым вырошчванні гуркоў. У нас асобныя гаспадары-аматары ўжо гадоў 10—15 гадуюць экзатычных страусаў, частуюць гасцей яечняй з іх вялізных яек, разводзяць курэй і качак розных заморскіх пародаў. Апошнім часам у нас становіцца папулярнай гадоўля чорных в'етнамскіх свіней. Апошнія — унікальныя жывёлы. Яны даюць высокія прывагі, непатрабавальныя ў кармах, любяць звычайную траву. Я ўпэўнены, што ў нас адбудзецца выбух у вытворчасці мяса, калі нашы вяскоўцы пачнуць гадаваць в'етнамскіх свіней.

— А вось як на практыцы дапамагчы вяскоўцу з глыбінкі засвоіць перадавую агратэхніку і тэхналогію, набыць насенне, правільныя саджанцы і расаду?

— Для гэтага я раіў бы ў раёнах стварацьдля ахвотных павысіць сваю сельгасадукацыю спецыяльныя кароткатэрміновыя (адзін тыдзень) аграрныя школы. І запрашаць на іх практыкаў-фермераў з вядучых аграрных краін Еўропы: Галандыі, Даніі і іншых. І гэта не вялікія выдаткі. У якасці спонсара можна запрасіць Еўрасаюз, там ёсць праграма па развіцці рэгіёнаў. Яе можна далучыць да праграмы «Усходняе партнёрства». Дарэчы, у нас ужо ёсць неблагі вынік навучання дзяцей нашых фермераў у аграрных школах Вялікабрытаніі, Германіі, іншых краін. На мой погляд, цікавая практыка садзейнічання стварэнню фермерскіх дынастый. Дык чаму ўвогуле абмен досведам і ведамі, навыкамі не наладзіць на якасна новым узроўні на беларускай зямлі? Між іншым, такая завочная вучоба ўжо ідзе. Напрыклад, жыхары нашых заходніх рэгіёнаў актыўна пераймаюць сельскагаспадарчы досвед прыватных гаспадарак Польшчы. Першыя гуркі, трускалкі, маладая бульба на рынак Мінска і абласных цэнтраў паступаюць з Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, дзе навучыліся вырошчваць раннюю гародніну. Дык чаму не распаўсюджваць гэты досвед у іншых рэгіёнах?

— Зразумела, сучасныя аграрныя тэхналогіі і элітнае насенне можа спатрэбіцца тым вяскоўцам, якія любяць зямлю і жывёлу, а таму хочуць весці хатнюю гаспадарку на ўласным падворку. А як у новых умовах зацікавіць, а магчыма, і цывілізавана прымусіць тых, хто вагаецца, сумняваецца ў мэтазгоднасці мець падсобную гаспадарку?

— Новае — гэта даўно забытае былое. Я неяк у архівах Калінінграда (раней Кёнігсберг) знайшоў цікавыя дакументы пазамінулага стагоддзя на падобную нашай размове тэму. Згодна з гэтымі паперамі, кожнаму селяніну прадпісвалася мець пэўную колькасць садовых дрэў, пэўны спіс жывёлы і птушак. За гэтым спісам уважліва сачылі і за тымі, хто не выконваў свайго абяцання, штрафавалі. Між іншым, расійскія цары ў адказ на дадзеныя сялянам-перасяленцам землі на ўскрайках імперыі, цяперашніх Казахстана, Туркменістана, патрабавалі трымаць моцную падсобную гаспадарку.

Я думаю, што і цяпер можна выкарыстаць гэты досвед. Скажам, на льготных умовах маладая сям'я атрымоўвае ўчастак зямлі, крэдыт на пабудову дома, але за гэту ласку мясцовай улады няхай трымае карову, парсючка, невялікі сад і агарод. А то ўзялі моду заводзіць англійскія газоны і штотыдзень іх касіць. Хутка забыліся, як кароў пасвілі ў бацькоў ці бабуль на канікулах.

— А што вы думаеце наконт Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёсак краіны на 2005—2010 гады? Там таксама ставіліся мэты па развіцці асабістых падсобных і фермерскіх гаспадарак. Гэтыя мэты аказаліся не дасягнутымі. Чаму?

— Адказ на пытанне просты: праграма калі і не атрымалася, то ў няпоўнай меры, бо яна адразу была накіравана на ўзвядзенне аграгарадкоў, сучаснае абсталяванне новых фермаў і аб'ектаў аграпрама. Яна была завязана больш на інфраструктуру, чым на падтрымку падсобных гаспадарак. Таму я не ганьбіў бы выканаўцаў гэтай праграмы, яны шмат зрабілі.

— Дарэчы, старшыня Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч на той нарадзе сказаў, што падсобныя гаспадаркі маюць вялікі патэнцыял па нарошчванні паставак прадукцыі на экспарт. Вы згодны?

— Відаць, Пётр Пятровіч меў на ўвазе тое, што апошнім часам экспарт малочнай прадукцыі стаў вельмі выгадным. Ёсць усе падставы нарошчваць аб'ёмы малочнага экспарту. Але для гэтага патрэбна больш сыравіны. І свой важкі ўнёсак у гэту справу могуць зрабіць падсобныя гаспадаркі.

— Ад моцнай асабістай падсобнай гаспадаркі адзін крок да малога і нават, магчыма, сярэдняга прадпрымальніцтва ў аграрным сектары. Ці так?

— Вельмі часта першы станоўчы гаспадарча-камерцыйны досвед бывае матывам працягваць справу ў большым маштабе, паступова займацца малым бізнэсам. Чалавек павінен прайсці пэўны шлях, крок за крокам да ўсведамлення карысці для сваёй сям'і ад працы на зямлі. А мясцовым уладам варта было б выпрацаваць сістэму заахвочвання развіцця падсобных гаспадарак. Напрыклад, шматпрацэнтнае зніжэнне падаткаў. А для выдачы льготных мікракрэдытаў вяскоўцам адкрыць новы кааператыўны прыватны банк. Бо Белаграпрамбанк у асноўным крэдытуе вялікія праекты ў аграпрамысловым сектары. А вось для хатніх гаспадарак патрэбны свой банк.

— А як у нашых суседзяў у Еўрапейскім саюзе ставяцца да развіцця падсобных гаспадарак грамадзян?

— Там іх развіццё, як і ўвогуле ўсяго малога бізнэсу, у Еўропе разглядаецца як адзін са шляхоў выхаду з крызісу. Невыпадкова ў ЕС днямі завяршыўся тыдзень малога і сярэдняга бізнэсу. Яго мэта — актывізацыя і падтрымка прадпрымальніцтва на мясцовым, рэгіянальным і нават еўрапейскім узроўнях. Бачыце, як сур'ёзна ставіцца пытанне. А ўсё таму, што сёння малыя і сярэднія прадпрыемствы ствараюць найбольшую колькасць працоўных месцаў у ЕС. Менавіта яны здольныя стаць тым лакаматывам, які выцягне еўрапейскую эканоміку і яе валюту з крызісу. У мерапрыемствах Тыдня ўдзельнічала больш за 3 мільёны чалавек з 37 краін Еўропы. Хоць у час крызісу малыя і сярэднія прадпрыемствы ЕС страцілі больш за 3 мільёны працоўных месцаў. Аднак іншыя лічбы сведчаць пра жыццяздольнасць гэтага сегмента эканомікі, дзе за шэсць дакрызісных гадоў было створана амаль дзевяць з паловай мільёнаў працоўных месцаў, што больш, чым у вялікім еўрапейскім бізнэсе.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Крымінал, здарэнні

ЗАЗІРНУЛІ ЗА АБШЫЎКУ

На ўскраіне Баранавічаў супрацоўнікі аўтаінспекцыі і транспартнага аддзела спынілі мікрааўтобус «Мерседэс». У салоне знаходзіўся бензін і салярка на 500 тысяч рублёў. Дакументаў на паліва не было.

Відавочна, гэтай «кантрабандай» 31-гадовы вадзіцель хацеў адцягнуць увагу міліцыянераў ад асноўнага грузу. Супрацоўнікі міліцыі прыцягнулі сценкі салона — вельмі ж тоўстымі яны былі. Калі знялі абшыўку, то знайшлі там 1620 літраў спірту ў 5-літровых пластыкавых бутлях.

Спірт і паліва канфіскавалі, вадзіцеля чакае сур'ёзны штраф.

ПЯЦЬ ГАДОЎ ЗА МАРЫХУАНУ

Суд Лунінецкага раёна вынес прыгавор 23-гадоваму жыхару г. Мікашэвічы, які перадаў у лістападзе мінулага года знаёмаму ў калонію марыхуану.

Наркотыкі ён расфасаваў у пакецікі з-пад гарбаты і перадаў праз жанчыну ў калонію. А там марыхуану знайшлі. Хлопец атрымаў пяць гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, а абласны суд прыгавор пакінуў у сіле.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ТРЫ ТАПЕЛЬЦЫ ЗА ВЫХАДНЫЯ

Прыхільнікаў адпачываць ля вады становіцца ў цёплы час усё больш. Але ж вада забірае тых, хто ставіцца да яе бяспечна.

У рацэ Іпуць, што ў Добрушскім раёне, знайшоў апошні прытулак 49-гадовы мясцовы жыхар. У Прыпяці патануў непрацуючы 23-гадовы жыхар Петрыкава, які знаходзіўся ў нецвярозым стане. 54-гадовы жыхар Рагачова кіраваў лодкай у пойме Друці. Яго драўляная «казанка» перавярнулася разам з гаспадаром.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДЗВЕ АХВЯРЫ РАНІШНЯЙ АВАРЫІ

6 чэрвеня ў Круглянскім раёне а палове на 6-ю раніцы аўтамабіль «Пежо-607» з'ехаў у кювет і моцна ўдарыўся аб прыдарожнае дрэва, паведамілі ў Магілёўскай ДАІ.

Вадзіцель, верагодна, не справіўся з кіраваннем на вялікай хуткасці. Мужчына загінуў, яму было 26 гадоў. Два пасажыры былі шпіталізаваныя, але адзін з іх, 19-гадовы хлопец, хутка памёр у бальніцы.

Ілона ІВАНОВА.

НЯГОДНІК АБАКРАЎ ДЗЯЦЕЙ У САДКУ

У дзіцячы садок па вуліцы Дзяржынскага ў Кобрыне прабраўся зламыснік і пазабіраў адзенне і абутак дзяцей і выхавальнікаў з дзвюх групаў. Злодзея шукаюць.

Яна СВЕТАВА.

Кірмаш
штотыдневы рэкламны выпуск
дадатак газеты «Звязда» № 12 (637)

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Недабудаваны дом 11х12, уч. 0,25 га ў г.п. Карэлічы Гродзенскай вобл.
Тэл. Vel. 337 31 57.

❒ Бульбакапалка, касілка конная, бульбасаджалка 2-радковая трактарная.
Тэл. 8 029 699 80 87.

❒ Зруб б/к 15х8 у р-н р. Нёман в. Беражное Карэліцкага р-на.
Тэл. Velkom 346 16 32; 346 16 63.

❒ Кабыла, 17 гадоў. Вельмі добрая і спакойная.
Тэл. маб. 8033 631 31 08.

❒ Біблія за 5000 руб., падару хрысціянскую літаратуру.
Тэл. 8 0212 25 80 79.

❒ Пежо-206 2002 г.в.; 2,0, НДІ, універсал, светла-жоўты металік, эл. шкло, р. бяспекі, рэгулятар фараў, гідраўзмацняльнік, выдатнае становішча.
Тэл. 8 02155 4 18 63.

❒ Лазня (4х4) + прыбудова (2х4) на вываз, танна. 100 км ад Мінска, 20 км ад Бягомля.
Тэл. МТС 599 3 660.

❒ Бульбасаджалка КСМ-4А.
Тэл. +375 444 54 48 60.

❒ Дом з пабудовамі, добрае месца для адпачынку, сад, на хутары. Побач лес, возера ў Ашмянскім р-не, пас. Багданава.
Тэл. 8 01772 45 501.

❒ Зруб новы 6х6, укамплектаваны, паўбрус, сасна. Цэны дагаварныя.
Тэл. 8 01772 53 926.

❒ Медагонка за 500 000 руб.

❒ Мяняю 2 новыя пакрышкі ад электракара на жыгулёўскія.
Тэл. у Барысаве 74 64 29.

❒ Газавая пліта «Гефест» новая 50х57 см з грылем 790 000 руб.
Тэл. 8 017 295 96 84, 8029 115 56 99.

КУПЛЮ

❒ А/м ЛУАЗ-969 у добрым стане.
Тэл. +375 336 88 81 96 (МТС).

МЯНЯЮ

❒ Да самаробнага трактара пярэдні, задні мост і каробку перадач на л/а ВАЗ-2106.
Тэл. 8 01591 3 12 57.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2741. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Жыткавіцкі маторабудаўнічы завод» Віктар КУР'ЯНОВІЧ:

«ЗА 30 ГАДОЎ ДЗЕЙНАСЦІ Ў КАЛЕКТЫВУ ПРАДПРЫЕМСТВА БЫЛІ І ЎЗЛЁТЫ, І ПАДЗЕННІ. АЛЕ — ВЫСТАЯЛІ»

— Віктар Уладзіміравіч, калі падсумаваць час вашай працы на гэтым прадпрыемстве, дык атрымаецца...

— ...што я тут ужо 27 гадоў. А заводу — 30.

— Значыць, можна сказаць, што вы — старажыл, ветэран вытворчасці, на вачах і пры актыўным удзеле якога і ствараласа гісторыя прадпрыемства. Згодны?

— Пярэчыць не буду. Усё правільна.

— Давайце тады зазірнём у гісторыю: як-ніяк, а заводу — амаль трэць стагоддзя.

— Створаны ён быў у 1980 годзе Міністэрствам авіяцыйнай прамысловасці СССР. Яго спецыялізацыя тады была: выпуск маларазмерных авіяцыйных рухавікоў, рухавікоў для крылатых ракет, дэталяў, вузлоў і запчастак для патрэбаў авіяцыі. Гэта прадукцыя да 1993 года складала 98 працэнтаў усяго яе аб'ёму.

Наш завод уваходзіў у склад Рыбінскага ордэна Леніна вытворчага аб'яднання маторабудавання, і мы па-сапраўднаму адчувалі сур'ёзную падтрымку галаўнога прадпрыемства ў тэхналагічных і канструктарскіх рашэннях, пытаннях укаранення ноу-хау, навучанні нашых кадраў і да т.п.

У рамках вышэйназванай тэматыкі і надалей прадугледжвалася будаўніцтва трох чэргаў завода, у выніку чаго колькасць працуючых на ім павінна была дасягнуць каля дзевяці тысяч чалавек, і мы такім чынам асвоілі б большую наменклатуру малагабарытных рухавікоў, прызначаных для самалётаў і малых ракет.

— Дзевяць тысяч працуючых? У палескай глыбінцы? Ці не фантастыка гэта?

— А чаму тут здзіўляцца? Была адзіная магутная краіна, адзіная эканоміка, адна сістэма планавання і г.д. У Савецкім Саюзе ў розных рэгіёнах, як вядома, і больш маштабныя прадпрыемствы ўзводзіліся, цэлыя гарады ствараліся. Дарэчы, калі гаварыць па вялікім рахунку, то і Жыткавічы, як горад, набылі зусім іншае аблічча і імідж дзякуючы нашаму заводу. Менавіта мы практычна пабудавалі яго: узвялі два жылыя мікрараёны, паліклініку, больш за дзесяць крамаў, два дзіцячыя садкі, школу, басейн, адкрылі спартшколу «Матор», водазабор, помпавую станцыю, ачышчальныя збудаванні, усе інжынерныя камунікацыі. Пачалі будаваць гасцініцу, лазню...

— Мяркуючы па ўсім, задуманае да канца давесці не ўдалося: перашкодзіў распад Савецкага Саюза?

— Менавіта так. Але перш чым перайсці да гэтага балючага пытання, зазначу наступнае. Наш завод адначасова і будаваўся, і выпускаў прадукцыю, размясціўшыся на тэрыторыі былой вайсковай часці, дзе былі розныя збудаванні, якім мы давалі другое жыццё. Аснашчалі іх адпаведным абсталяваннем, наладжвалі вытворчасць, вырабляючы дэталі для рухавікоў. У гэтым плане не пашанцавала двум іншым палескім прамысловасці ўжо незалежнай Беларусі прапанавала нам асвоіць выпуск масляных шасцяронных помпаў, якія ў той час закупляліся ва Украіне.

Калі прызнацца шчыра, то мы з цяжкасцямі ўваходзілі ў новую для нас справу па розных прычынах. Даводзілася ад маласерыйнай пераходзіць да буйнасерыйнай прадукцыі. Ды нічога, справіліся. Цяпер практычна выпускаем амаль усю гаму гэтай прадукцыі, і згаданы напрамак займае каля 30 працэнтаў агульнага аб'ёму вытворчасці. У тым ліку помпы масляныя шасцяронныя аб'ёмнага гідрапрывода тыпу НШ-10, НШ-14, НШ-16, НШ-50А, НШ-50У, НШМ-25, НМШ-32 і г.д.

— Цяпер, Віктар Уладзіміравіч, як нам вядома, завод уваходзіць у склад вытворчага аб'яднання «Мінскі маторны завод». Ці азначае гэта, што вам, як кажуць, стала весялей жыць?

— Пачну з таго, што ў 2004 годзе завод планавала купіць Маскоўскае машынабудаўнічае вытворчае прадпрыемства «Салют», якое з'яўляецца самым буйным «авіярухальным» прадпрыемствам Расіі. Але нам не дазволілі пайсці на гэта, бо яго кіраўнікі паставілі жорсткія ўмовы: кантрольны пакет акцый павінен быць у іх. У частцы статутнага капіталу прадпрыемства паспела паставіць нам 56 металаапрацоўчых станкоў, і калі мы ў 2004 годзе ўвайшлі ў структуру Мінскага маторнага завода, маючы заказы і абсталяванне, то дасягнулі вельмі высокіх тэмпаў росту аб'ёмаў — 130—140 працэнтаў.

Гэтаму ў значнай ступені садзейнічалі і іншыя фактары: наяўнасць адказнага высокакваліфікаванага персаналу, імкненне нарошчваць і ўмацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Калі я стаў дырэктарам, мы набылі па недарагой цане шмат абсталявання, якое прадавалі прадпрыемствы з-за таго, што апынуліся на парозе фінансавага краху. У нас яно пастаянна мадэрнізавалася, удаскаладнялася і ў выніку давала і дае цяпер значны эканамічны эфект.

Адносна пытання аб «вясёлым жыцці» ў складзе Мінскага аб'яднання скажу наступнае. У нас з'яviліся стабільныя заказы, пачаўся пад'ём, і на працягу трох гадоў мы падвоілі аб'ёмы выпускаемай прадукцыі. Яе структура мае цяпер чатыры асноўныя напрамкі: вытворчасць камплектавых частак для дызельных рухавікоў; вытворчасць дэталяў і вузлоў для вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш»; вытворчасць авіяцыйных дэталяў і рамонт авіяцыйных рухавікоў. Асноўнымі спажыўцамі нашай прадукцыі ў Беларусі, акрамя «Гомсельмаша», з'яўляюцца мінскія прадпрыемствы — Мінскі маторны завод, трактарны і аўтамабільны заводы, «Амкадор» і іншыя.

Дырэктар ААТ «Жыткавіцкі маторабудаўнічы завод» Віктар КУР'ЯНОВІЧ.

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Ураджэнец Калінінградскай вобласці, куды па волі лёсу трапілі пасля вайны бацькі. Пражыванне там сям'і было нядоўгім, і ў 1953 годзе яна вярнулася на радзіму бацькі, дзе ў Жыткавічах юнак закончыў васьмігодку, пасля чаго паступіў вучыцца ў Лідскі індустрыяльны тэхнікум.

Працоўная дзейнасць яго пачалася на вядомым шклозаводзе «Нёман». Потым была служба ў арміі і вучоба ў брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце. Па дзяржаўным размеркаванні малады спецыяліст трапіў у Жыткавічы і на розных пасадах працаваў у мясцовай перасоўна-механізаванай калоне. Ваенкамат у той час рабіў набор спецыялістаў рознага профілю ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, дзе вырашыў папрацаваць і Віктар Кур'яновіч.

У 1983 годзе ён вярнуўся ў Жыткавічы і быў прыняты на працу на маторабудаўнічы завод. Начальнік аддзела капітальнага будаўніцтва, намеснік дырэктара па будаўніцтве, а затым і па эканоміцы, і вось ужо дзясяты год — кіраўнік завода — такія прыступкі яго прафесійнага і кар'ернага росту.

Кантралёр АТК цэха № 5 па рамонце і зборцы турбастартараў ТС-21 для авіяцыйнай тэхнікі Таццяна ПУЗЕВІЧ — сапраўдны майстар сваёй справы.

Гэта далека не ўся гатовая прадукцыя Жыткавіцкага маторабудаўнічага завода.

Наладчык станкоў і маніпулятараў з лікавым праграмным кіраваннем Валерый ШЫЛА, які працуе ў механічным цэху № 7, упэўнены, што галоўнае ў яго працы — дакладнасць, уважлівасць, уменне правільна і «матэматычна» думаць.

— А як справы са знешнімі пастаўкамі?

— Прыярытэтным рынкам для нас з'яўляецца рынак Расійскай Федэрацыі, і асобнае месца ў дзелавым супрацоўніцтве займае Масква, дзе знаходзяцца найбуйнейшыя аптовыя рынкі Расіі. Шасцяронныя помпы пастаўляем на рынкі Егіпта і Пакістана. З калектывам вышэйназванага «Салюта» мы сувязяў не гублялі і стараліся наладжваць адносіны з ім на новай аснове. Калі пачаўся чарговы фінансава-эканамічны крызіс, наша авіяцыйная прадукцыя складала ўсяго адзін працэнт у яе агульным аб'ёме. Летась — 16, а сёлета — ужо 18. Сапраўдны ўзлёт.

— Вядома, што вырабы для авіяцыі — высокадакладныя, высокатэхналагічныя...

— Зразумеў вас і скажу, што ў нас ёсць усё для таго, каб да нас не было прэтэнзій. Адзін толькі прыклад. Мы набылі дзевяць японскіх апрацоўчых цэнтраў, якія практычна замяняюць увесь цэх з агрэгатным абсталяваннем. Наша вытворчасць сертыфікавана па міжнародных стандартах. На высокатэхналагічнае абсталяванне мы грошай не шкадуем.

Скажу яшчэ і пра тое, што ў нас наладжана ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва і з такімі авіяцыйнымі прадпрыемствамі, як Омскае машынабудаўнічае аб'яднанне імя Баранава, Чалябінскі і Ейскі авіярамонтныя заводы. Прадукцыя авіяцыйнага профілю высокарэнтабельная — ад 35 да 300 (па некаторых пазіцыях) працэнтаў.

— Што б вы хацелі, Віктар Уладзіміравіч, пажадаць свайму калектыву напярэдадні юбілею?

— Моцнага здароўя. Творчага настрою. Дабрабыту. Яшчэ большага старання. Хоць калектыў не дасягнуў вышыняў васьмідзясятых гадоў, але мы паступова ідзём наперад. У нас распрацаваны стратэгія развіцця на 2010—2013 гады і праекты паскоранай мадэрнізацыі вытворчасці ў яе рамках. Сума інвестыцый у асноўны капітал складзе 21,4 мільярда рублёў. Вялікія грошы, асваенне якіх дасць вялікі эканамічны эфект. Са святам, паважаныя калегі!

Матэрыял падрыхтавалі Уладзімір ПЯТРОВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Вікенція КІЖНЁВА.

Слесар механазборачных работ Віталь ЦЯРЭНЯ (з той самай слыннай заводскай дынастыі) і Дзмітрый МАЧУЛЬСКІ не першы год працуюць на ўчастку зборкі і выпрабавання масляных помпаў, якія пастаўляюцца на заводы не толькі нашай краіны, але і Расійскай Федэрацыі, Егіпта, Пакістана.

ААТ «ЖЫТКАВІЦКІ МАТОРАБУДАЎНІЧЫ ЗАВОД»
247960,
Гомельская вобласць,
г. Жыткавічы
тэл. 8 +02353 2 28 08,
факс 8 +02353 2 20 41
УНП 400049955

Выпрабавальнік з трыццацігадовым стажам Мікалай МАРУСІЧ праводзіць выпрабаванні авіяцыйнага турбастартара.

На заводзе паспяхова працуе і карыстаецца аўтарытэтам сямейная дынастыя Цярэняў. На змену крочаць аператар пракатнага стана і наладчык прэсавага абсталявання Мікалай ЦЯРЭНЯ, яго жонка Таццяна, загадчыца склада гатовай прадукцыі, і малодшы сын Аляксей, штампоўшчык.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.38	16.58
Віцебск —	4.21	21.35	17.14
Магілёў —	4.30	21.28	16.58
Гомель —	4.36	21.15	16.39
Гродна —	4.56	21.52	16.56
Брэст —	5.06	21.43	16.37

Месяц

Апошняя квадра 5 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Івана, Ферапонта.*

К. *Яўгеніі, Адрыяна, Антонія, Густава, Роберта, Яраслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+30..+32°С	КІЕЎ	+30..+32°С	РЫГА	+13..+15°С
ВІЛЬНЮС	+25..+27°С	МАСКВА	+17..+19°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+18..+20°С

МАРШРУТКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ СПРАЎНЫМІ!

Падведзены вынікі дэкады «Маршрутка», падчас якой рэйдавыя экіпажы ў саставе супрацоўнікаў УП «Белтэхнагляд», Дзяржаўтаінспекцыі і Транспартнай інспекцыі Мінтранса звярталі ўвагу на вонкавы выгляд маршрутак, стан салона, шынаў і светлавых прыбораў.

Агулам па ўсіх абласных і раённых цэнтрах было праведзена больш за 170 рэйдаў і праверана 1 406 транспартных сродкаў. З выяўленых 211 парушэнняў 207 прыпадаюць на тэхнічныя няспраўнасці транспартных сродкаў, астатнія — выпадкі выяўлення транспартных сродкаў без дзяржтэхагляду. Падробленых сертыфікатаў і штампаў аб праходжанні дзяржтэхагляду выяўлена не было.

Самымі распаўсюджанымі выяўленымі неадпаведнасцямі можна назваць значныя каразійныя пашкоджанні кузава і падножкі дзвярэй службовага выхаду, няспраўнасць замыкальнага прыстасавання дзвярэй запаснога выхаду, адсутнасць неабходнай колькасці вогнетушыцеляў, неўкамплектаванасць медыцынскай аптэчкі, гранічны знос пратэктара колаў. Падобныя дэкады будуць праводзіцца і надалей.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Смецце стане даражэй

У Беларусі плануецца зрабіць больш жорсткай адміністрацыйную адказнасць грамадзян за выкідванне смецця ў недазволеным месцы. Размова ідзе аб т. зв. дробным смецці — тым, што выкідваецца, напрыклад, у гарадскія сметніцы. Самымі праблемнымі ў гэтым плане з'яўляюцца пляжы, прыпынкі транспарту, прыгарадныя і лесапаркавыя зоны. Ва Украіне, між тым, за недакурак, што кінуты міма урны, могуць аштрафаваць на 180 грыўняў.

8 чэрвеня

Дзве даты

1895 год — нарадзіўся (в. Пагіры, сёння Дзятлаўскі раён) Ігнат Сямёнавіч Дварчанін, вядомы беларускі літаратуразнаўца, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Вёў культурна-асветніцкую работу на Дзятлаўшчыне, у Даўгаўпілсе (Латвія). З 1926 года — у Вільні на выкладчыцкай працы. У 1928-30 гадах быў адным з кіраўнікоў Галоўнага ўпраўлення ТБШ. У 1928 годзе абраны паслом у Польскі сейм. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштоўваўся польскімі ўладамі, быў асуджаны, вызвалены ў 1932 годзе ў выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у камісіі АН Беларусі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Аўтар вершаў, публіцыстычных твораў. У 1927 г. выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 года)» для сярэдніх школ, якая адыграла вялікую ролю ў навучанні і патрыятычным выхаванні. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць». У 1933 годзе рэпрэсаваны, у 1937-м — расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.



1934 год — у СССР прыняты закон «Аб здрадзе радзіме», які прадугледжваў калектыўную адказнасць усіх членаў сям'і.

Цытата дня:

«Каб навучыць людзей любіць справядлівасць, трэба паказаць ім вынікі несправядлівасці».

Адам Сміт (1723—1790), шатландскі эканаміст і філосаф.

Універсальная лічба

Універсальным лік сорак называюць таму, што ён задае гадавому колазвароту святаў пэўную рытмічнасць і чаргаванне. Так, калі ўлічыць, што ў архаічным календары славян чатыры святы былі прымеркаваныя да зімовага і летняга сонцастаянняў і веснавога і восеньскага раўнадзенства, а яшчэ чатыры былі прымеркаваны да пераходных, міжфазавых тэрмінаў, то атрымаецца, што паміж асноўнымі святочна-абрадавымі комплексамі быў інтэрвал у сорак дзён.

● Менавіта саракадзённы інтэрвал захоўваецца паміж Раством Хрыстовым і Стрэчаннем, або Грамніцамі. У гэты дзень Дзева Марыя атрымала права ўпершыню пасля родаў наведаць храм і прачытаць ачышчальную малітву. На саракавы дзень пасля Уваскрэсення Хрыста адзначаецца свята Ушэсце. Такі ж адрэзак часу захоўваецца паміж Яблычным Спасам і Узвіжаннем.

● На пачатку фарміравання хрысціянства як рэлігіі Вялікі (перадвелікодны) пост працягваўся **сорак** дзён (такім па працягласці ён застаўся ў каталікаў), роўна столькі ж доўжыліся разам узятыя Пятроўскі і Спасаўскі пасты, а таксама Піліпаўскі пост.

● Лічба-універсум шырока адлюстраваная ў каляндарных назіраннях чалавека за прыродай. Лічылася, калі на Саракі будзе мароз, то трэба чакаць яшчэ **сорак** замаразкаў, «Калі на Іллю дождж, то і пасля Іллі **сорак** дзён тож».

● Святочныя кантэксты, звязаныя з гарманізацыяй сямейных адносінаў, таксама падуладныя сімволіцы гэтага ліку. Напрыклад, хто на Дабравешчанне назаве мужа **сорак** разоў «любы», увесь год будзе цешыцца і радавацца яго добрым адносінам.

● Адзначым і тое, што лік **сорак** аказаўся вызначальным і ў звычаёвым праве іудзеяў. У Старым запавеце знаходзім: «І калі віноўны варты будзе біцця, то суддзя няхай загадае палажыць яго і біць пры сабе, гледзячы па віноватасці яго, па ліку. **Сорак** удараў можна даць яму, а не больш...».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Кошт новага пыласоса атрымаўся вышэйшы за той, на які разлічвала пакупніца.

— У нашай краме праходзіць акцыя, — паведаміў прадавец. — Мы можам абмяняць стары электрапрыбор на новы з даплатай. У вас дома што-небудзь валяецца без справы?

— Так. Мой муж.

☺

Андрэй Малахаў да сваіх 40 гадоў прамовіў больш слоў, чым усё насельніцтва Ліхтэнштэйна разам узятае за ўвесь час існавання гэтай дзяржавы.

☺

Дыялогі ў сцеіве.

— Падкажыце, якія цяпер правілы правозу веласіпеда ў электрычцы?

— Такія, як і раней: калі змог улезці, дык едзеш, калі не — чакаеш наступную.

☺

Заўтра адключаюць гарачую ваду.

Сёння трэба памыць паболей посуду...

☺

— Я хачу сабе язык пракалоць. У двух месцах. Як зрабіць, каб было сіметрычна?

— Стэплерам...